Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 230 (5904) | 5 кастрычніка 1937 г., аўторак | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Узброіцца для барацьбы з контррэволюцыяй у папоўскай расе.

АРТЫКУЛЫ:

І. Турэцкі, І. Бараноўскі — У Белдзяржопірце па-ранейшаму творацца агіднасці — 2 стар.

Р. Вольскі — Вызначэнне вынікаў выбараў.— 3 стар.

Р. Фралоў — Новыя кадры — 2 стар.

Д. Бугаёў, В. Карнілаў — Знішчаюць гатункове насенне — 2 стар.

На міжнародныя тэмы:

А. С. — Пасля візіта Мусаліні ў Берлін. — 4 стар.

Рэспубліка рыхтуецца да выбараў у Вярхоўны Совет — 3 стар.

Перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва:

Множацца рады ўдзельнікаў спаборніцтва — 2 стар.

Закончыліся вучэнні па проціпаветранай абароне Менска — 4 стар.

ЗА РУБЯЖОМ:

На франтах у Іспаніі. Паўстанне сялян у фашысцкім тылу. Лютая бамбардыроўка Валенсіі.

Англа-французская нота аб інтэрвенцыі ў Іспаніі.

Адозва компартыі Францыі да французскага народа.

Антыфашысцкія дэманстрацыі ў Англіі.

УЗБРОІЦЦА ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З КОНТРРЭВОЛЮЦЫЯЙ У ПАПОЎСКАЙ РАСЕ

Рэлігія — опіум для народа. У класавым грамадстве рэлігія з'яўляецца магутнай зброяй у руках эксплаататараў, карыстаючыся якой яны стрымліваюць працоўных ад рэвалюцыйнай барацьбы. Адурманьваючы сазнанне працоўных, яна вучыць іх «смірэнню» і «павінаванню» сваім прыгнятальнікам, заклікаючы да «непраціўлення злу», «любіць ворагаў» і «даравать ненавідзячым». Вось чаму буржуазія так узмоцнена падтрымлівае царкву, аказвае ёй матэрыяльную дапамогу, ствараючы ўсе ўмовы для гнуснай і каварнай работы духавенства.

На працягу цэлых стагоддзяў царква была арганізацыяй, варожай інтарэсам працоўных, царква з'яўляецца такой-жа і зараз. Пад маркай царкоўнікаў і кіраўнікоў розных рэлігійных сект часта тоящца прамыя ворагі народа, шпіёны і дыверсанты, якія, прыкрываючыся «рэлігійнасцю», праводзяць падрыўную работу.

У старой царскай Расіі царква з'яўлялася неаддзельнай часткай дзяржавы, прадаўжэннем яе паліцэйскага апарата. Царква не толькі прапавядала ў масах рэакцыйныя ідэі і гэтым самым стрымлівала іх ад рэвалюцыйных выступленняў супроць самадзяржаўя, але і з'яўлялася апорай царскай ахранкі. Праз сваіх зерных сышчыкаў — папоў і манахаў царква выследжвала рэвалюцыянераў і выдавала іх у рукі царскіх катаў.

У перыяд рэвалюцыі 1905 года духавенства актыўна дапамагала Нікалаю крывавраму душыць узброенае паўстанне рабочых, якія хацелі скінуць ненавісны царскі лад і заваяваць сабе палітычныя свободы. У 1917 годзе царкоўнікі таксама выступалі актыўна супроць рэвалюцыі. Асабліва шалёна сустрэла царква вялікую соцыялістычную рэвалюцыю, якая пазбавіла яе падтрымання дзяржавы, адабрала зямлю, багацце і падарвала ў корані ўплыў царквы на масы.

Шалёная ярасць авалодала духавенствам, пазбаўленым права эксплаатаваць народ. Папы падняслі зброю супроць народа. У годы грамадзянскай вайны папы нярэдка выступалі супроць малодой совецкай улады са зброяй у руках, арганізуючы так называемыя «ісусавы палкі» ў белагвардзейскіх арміях.

Жорсткую барацьбу вёў народ з духавенствам, падняўшым сваю руку супроць нараджаючайся ўлады рабочых і сялян. Бязлітасна прапоўныя выкрывалі папоў, ксяндзоў, мул, рабінаў і іншых «святых айцоў», якія дапамагалі белагвардзейскім бандам змагацца супроць совецкай улады. У той-жа час партыя пераканвала прапоўных у шкодлівасці рэлігіі, даказваючы ўсю бязглуздзіцу рэлігійных забабонаў, запамяноючых класавае сазнанне рабочых і сялян.

Царкоўнікі не спынілі сваёй контррэволюцыйнай дзейнасці і пасля таго, як совецкая ўлада ўмацавалася. Яны толькі змянілі формы і метады сваёй барацьбы супроць дыктатуры пролетарыята. Калі раней рэакцыйнае духавенства выступала адкрыта супроць мерапрыемстваў партыі і ўрада, то потым яно пачало дзейнічаць «ціхай сапай». Прыкідваючыся лаяльнымі совецкай уладзе людзьмі, царкоўнікі на словах выступалі за новыя парадкі ў краіне, а на справе вялі контррэволюцыйную работу, накіраваную на падрыў соцыялістычнага ладу.

За годы двух пяцігодак наша краіна далёка шагнула наперад. Вырасла і ўмацавалася соцыялістычная эканоміка як у горадзе, так і ў вёсцы. Ліквідаваны эксплаататарскія класы. Гэтым быў нанесен сакрушальны ўдар рэлігійным забабонам. Аднак, няправільна было-б думаць, што цяпер ужо антырэлігійную работу можна спыніць, што зераванні цяпер самі сабой адпадуць. Думаць так — значыць не разумець таго, што ў нашай соцыялістычнай эканоміцы і сазнанні людзей асталіся яшчэ перажыткі капіталізма. А рэлігійныя забабоны з'яўляюцца адной з рознавіднасцей гэтых перажыткаў, прычым найбольш моцных, асабліва ў вёсцы. Гэтыя перажыткі прабуе зыкарыстаць вораг і, прыкрываючыся рэлігіяй, як маскай, вядзе сваю подлую работу супроць народа.

Вось чаму антырэлігійная прапаганда ў нашай краіне павінна прадаўжацца з неаслабнай сілай, тым больш зараз, калі прапоўныя рыхтуюцца да выбараў у Вярхоўны Совет.

Канстытуцыя СССР прызнае за совецкімі грамадзянамі свободу адпраўлення рэлігійных культаў. У сувязі з гэтым многія папы пачалі праводзіць энергічную контррэволюцыйную агітацыю сярод веруючых. У радзе населішчаў яны вядуць нічым непрыкрытую агітацыю і, карыстаючыся бясклопатнасцю кіраўнікоў раёнаў, узялі ў свае рукі «растлумачэнне» Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. Яны ўжо сям-там вядуць агітацыю за сваіх кандыдатаў, абяцаючы веруючым усякія кары, калі апошнія не будуць галасаваць за іх кандыдата.

Усяляк прабуюць яны аднавіць тыя царквы, якія раней былі закрыты па патрабаванню насельніцтва, пры гэтым пускаючыся на ўсякага роду ўвёрткі аж да падробкі подпісаў. Нават гэтыя злачынныя махінацыі папоў у раёнах чамусьці засекрэчваюць, не раскрываюць перад масамі, раззбройваючы такім чынам масы перад наступаючай папоўшчынай. Контррэволюцыйнай дзейнасці папоў пара пакласці прадзел. Кіраўнікі, хаваючыя ад мас контррэволюцыйныя і ўсякія іншыя крымінальныя прадзелкі папоўшчыны, робяць злачынства. Маску з ворагаў у папоўскай расе пара знять. Іх агітацыі трэба прапіпаставіць сваю большэвіцкую агітацыю. Трэба расказать прапоўным усю праўду аб папах, ксяндзах і рабінах, аб іх барацьбе з калгасным ладам, аб іх дыверсійнай і шпіёнскай рабоце ў карысць замежных дзяржаў, у каорысць фашыстаў і іх гаспадароў — памешчыкаў і капіталістаў.

Вышай узнімем прапагандысцкую і агітацыйную работу, панясем большэвіцкае слова, слова класавай праўды ў масы. Выкрыем манеўры ворагаў, як-бы яны не хітрылі, у якую-б маску ворагі не апраналіся.

ДЭКЛАРАЦЫЯ ФРАНЦУЗСКАГА ЎРАДА

ПАРЫЖ, 2 кастрычніка. (ТАСС). Сёння пад старшынствам прэзідэнта рэспублікі Лебрэна адбылося пасяджэнне французскага ўрада. Перад гэтым пасяджэннем адбылася палеміка ў друку і ўсяляякія толкі ў палітычных колах.

Пасяджэнню ўрада прабавалі надаць значэнне свайго роду паваротнага пункту ў палітыцы кабінета Шотана. Фашысцкі друк прадракаў магчымасць урадавага крызіса, заяўляючы, быццам паміж міністрамі-радыкаламі і міністрамі-соцыялістамі існуюць непераможныя рознагалоссі.

Згодна афіцыйнага паведамлення, урад, заслухаўшы пытанне аб становішчы на валютным рынку, аднагалосна прыняў дэкларацыю. У дэкларацыі ўказваецца, што совет міністраў пацвярджае сваю адпадушную згоду наступнымі рашэннямі:

«1) Урад пацвярджае сваю волю аставацца верным палітыцы свободнай валюты і палітыцы, выказанай у валютнай зголзе, заключанай у 1936 г. паміж Францыяй, Англіяй і ЗША.

2) Урад рашуча будзе падтрымліваць палітыку міру, праводзімую на працягу 15 месяцаў з праемственасцю і поспехам Івон Дэльбосам, як ад імя кабінета Леона Блюма, так і ад імя сучаснага ўрада.

У згодзе з Англіяй урад разлічвае дабіцца ад іншых краін захавання неўмяшання за ўнутраныя справы Іспаніі. Урад будзе з усёй энергіяй абараняць жыццёвыя інтарэсы Францыі, імкнучыся падтрымліваць і развіваць мірныя адносіны з усімі краінамі.

3) Совет міністраў ухваляе заявы, зробленыя главой урада камісіі па абследванню прамысловасці, і дае яму мандат выпрацаваць неабходныя дэкреты для прымянення заключэнняў гэтай камісіі (аб рацыяналізацыі прадпрыемстваў і аб умовах працы на аснове закона ад 21 чэрвеня 1936 г. аб 40-гадзінным рабочым тыдні).

4) Урад напамінае ўсім грамадзянам аб неабходнасці грамадзкага парадку і соцыяльнай дысцыпліны. Асабліва ён звяртаецца з заклікам да прадпрыемцаў і рабочых, каб шляхам спакойнага арбітража ў канфліктах яны адмовіліся канчаткова ад усякіх манеўраў і ад усякіх незаконных дзеянняў (парушэнне калектыўных дагавораў ці свободы саюзаў, занятце прадпрыемстваў і інш.), паўтарэння якіх улады рашылі не дапускаць.

5) Рашыўшы пакласці канец усякаму ўзбуджанню і провокацыям некаторых інцыдэнтаў на тэрыторыі рэспублікі, урад ухваляе прапановы, нядаўна выкладзеныя главой урада і ўдакладненыя міністрам унутраных спраў, у мэтах ажыццяўлення нагляду і неабходных рэпрэсій супроць замежных падстрэкальнікаў.

6) Урад пацвярджае, што палітыка, указаная ў данай дэкларацыі, не можа быць пастаўлена пад пытанне прадстаячымі кантанальнымі выбарамі».

РАЖКОЎ С. І. — ордэнаносец, старшыня калгаса «Чырвоныя Яромкавічы», Аршанскага раёна. Фото Фрыдман (БСФ).

АДОЗВА КОМПАРТЫІ ФРАНЦЫІ ДА ФРАНЦУЗСКАГА НАРОДА

ПАРЫЖ, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). Комуністычная партыя апублікавала адозву да французскага народа ў сувязі з наступаючымі кантанальнымі выбарамі. Компартыя звяртаецца да ўсіх, хто імкнецца да падтрымання міру і парадку, росту вытворчасці, фінансавага аздараўлення краіны, захавання соцыяльнага заканадаўства і забеспячэння добрабыту працоўных.

Компартыя заклікае аказать падтрыманне народнаму фронту, які даў адпор французскім фашыстам, дапамог рабочаму класу і сялянству дабіцца паляпшэння свайго становішча, які імкнецца прадаставіць пенсіі прастарэлым працоўным, устанавіць правільнае размеркаванне падаткаў, ліквідаваць спекуляцыю і стварыць грамадскі фонд па барацьбе са стыхійнымі няшчасцямі ў сельскай гаспадарцы.

У адозве ўказваецца далей, што Францыя імкнецца к міру, які можа быць захован толькі пры ўмове забеспячэння поўнай незалежнасці народаў і арганізацыі калектыўнай бяспечнасці праз распыранне сістэмы пактаў усеемнай дапамогі па ўзору пакта, заключанага Францыяй з СССР.

Адозва падкрэслівае неабходнасць адзінства ўсяго народа, прадстаўляемага народным фронтам. «Камуністы, — гаворыцца ў адозве, — працягваюць брацкую руку ўсім, хто змагаецца за абарону жыцця і ластоінства чалавецтва супроць замахаў з боку сучасных варвараў».

У заключэнне адозва заклікае выбаршчыкаў галасаваць за спіс народнага фронта.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

У сектары на поўдзень ад ракі Тахо мяжэнікі адпавілі атакі на пазіцыі рэспубліканцаў закол Талехо. 2 кастрычніка рэспубліканцы адбівалі неадпаразовыя атакі мяжэнікаў на ўсходні і заходні флангі гэтых пазіцый. Раніцою 3 кастрычніка мяжэнікі зноў атакавалі пазіцыі рэспубліканцаў паблізу Талехо.

УСХОДНІ (арагонскі) ФРОНТ

3 кастрычніка артылерыя рэспубліканцаў бамбардыравала поезд з войскамі мяжэнікаў, які вышаў са станцыі Тэруэль. Цягунка на гэтым участку зруйнавана.

***

У рэзультаце бамбардыроўкі Валенсіі фашысцкімі самалётамі раніцою 3 кастрычніка налічваецца 30 забітых і 150 раненых. Фашысцкія «юнкерсы» скінулі над Валенсіяй больш 100 бомб. З афіцыяльных крыніц паведамляюць, што адна з фашысцкіх эскадрыллей насіла апазнавальныя адзнакі рэспубліканскай авіяцыі.

Вечарам 3 кастрычніка судно мяжэнікаў, карыстаючыся цемнатою, страляла па Барселоне, не маючы на ўвазе ніякіх ваенных аб'ектаў. Ёсць забітыя і раненыя. Матэрыяльныя страты нязначныя.

ЛЮТАЯ ПАВЕТРАНАЯ БАМБАРДЫРОЎКА ВАЛЕНСІІ

ПАРЫЖ, 3 кастрычніка. (БЕЛТА). Агенцтва Эспань паведамляе, што сёння Валенсія была падвергнута выключна лютай паветранай бамбардыроўцы з боку мяжэнікаў. Пад прыкрыццём туману самалёты мяжэнікаў прабавалі бамбардыраваць цэнтр горада, але былі адагнаны агнём зенітных батарэй. Пасля гэтага авіяцыя мяжэнікаў скінула на порт і прамесце Валенсія-дэль Грао каля 50 бомб. Сярод грамадзянскага насельніцтва ёсць шматлікія ахвяры.

Па паведамленню агенцтва Гавас, у рэзультаце бамбардыроўкі забіта 27 чалавек і ранена 60. Разбурана 22 дамы і рад грамадскіх будынкаў — кіно, базар і інш.

Самалёты мяжэнікаў пры бамбардыроўцы Валенсіі прымянялі бомбы велізарнай разбуральнай сілы. Агенцтва Гавас паведамляе, што ў сумежных з цытадэлью: кварталах жыццё працякае нармальна.

АНТЫФАШЫСЦКІЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў АНГЛІІ

ЛОНДАН, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). Учора ў паўднёвым раёне Лондана (Бермандсі) 2.700 фашыстаў мелі намер наладзіць шэствіе. На ахову фашыстаў было мабілізавана 2.000 паліцэйскіх. Велізарны натоўп антыфашыстаў пабудаваў барыкады на вуліцах, па якіх пазіны былі прайсці фашысты. Паміж паліцыяй і антыфашыстамі адбыліся сутычкі. Урэшце, паліцыя прапанавала фашыстам змяніць свой маршрут і яны прайшлі па пустуючых вуліцах, дзе іх ніхто не чакаў. Арыштавана 111 чалавек, пры сутычках ранена 30 чалавек, у тым ліку два паліцэйскіх.

Лонданская арганізацыя лейбарыстскай партыі рэкамендавала ўсім рабочым устрымацца ад контрдэманстрацыі ў сувязі з шэствіем фашыстаў, але, не гледзячы на гэта, натоўпы народа выйшлі на вуліцу для процідзеяння шэствію фашыстаў. Да позняй ночы ў паўднёвым раёне Лондана прадаўжаліся антыфашысцкія мітынгі, на якіх прыняты рэзалюцыі, патрабуючыя палажэння фашызма ў Англіі.

Антыфашысцкая дэманстрацыя адбылася таксама ў Абердзіне ў сувязі з арганізацыяй там мітынгу фашыстаў. Паліцыя, прабуючы разагнаць антыфашысцкіх дэманстрантаў, пусціла ў ход дубінкі.

ПРАБЫВАННЕ ЧЫРВОНАСЦЯЖНАГА АНСАМБЛЯ Ў ЧЭХАСЛАВАКІІ

ПРАГА, 3 кастрычніка. (БЕЛТА). Учора чырвонасцяжны ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі быў прыняты у ратушы прыматарам (гарадскім галавой) доктарам Зенклем і членамі муніцыпалітэта (гарадскога самакіраўніцтва). Доктар Зенкль у самых сардэчных выразах вітаў калектыў ансамбля — прадстаўнікоў Чырвонай Арміі СССР — і дзякаваў за наведанне Чэхаславакіі і, у прыватнасці, Прагі.

У адказным слове кіраўнік ансамбля прафесар Александраў дзякаваў за брацкі прыём, аказаны ансамблю чэхаславацкім народам.

Развітваючыся з калектывам ансамбля, доктар Зенкль сказаў: «Я не хачу гаварыць вам — бывайце, а толькі да пабачэння, бо мы шчыра хочам яшчэ многа раз бачыць вас, дарагіх гасцей, у нашай сталіцы — Празе».

Потым кіраўнік ансамбля прафесар Александраў і салісты ў суправаджэнні сакратара паўпрэдства СССР у Празе тав. Шапрова наведалі чэхаславацкае таварыства музыкальнага выхавання. Старшыня таварыства прафесар Кестынберг (саветнік міністэрства народнай асветы) на арганізаваным у гонар прыбыўшых банкеце віншаваў ансамбль ад імя чэхаславацкай музыкальнай грамадскасці з небывалым для Чэхаславакіі поспехам.

Учора вечарам у самым вялікім тэатральным зале Прагі быў дан канцэрт, на якім на гэты раз прысутнічала пераважна рабочая публіка. Канцэрт меў каласальны поспех. Гледачы закідвалі выканаўцаў кветкамі. «Таварыства культурнай і эканамічнай сувязі з СССР» паднесла ансамблю вялікі букет кветак з надпісам, у якім выказваецца ўдзячнасць за высокае мастацкае майстэрства. Па сканчэнні канцэрта ансамблю была зроблена шумная авацыя, у часе якой усе слухачы ў адзін голас агаласілі: «Няхай жыве Чырвоная Армія, няхай жыве Совецкі Саюз».

Потым ансамбль быў запрошан чэхаславацкім саюзам работнікаў мастацтваў у свой клуб, дзе адбыўся таварыскі вечар.

ПРЫЁМ ПАЎПРЭДА СССР тав. СЛАВУЦКАГА ІМПЕРАТАРАМ ЯПОНІІ

ТОКІО, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). Агенцтва Домей Пусін паведамляе, што 4 кастрычніка японскі імператар наладзіў снеданне ў гонар паўпрэда СССР у Японіі тав. Славуцкага. Пасля снедання адбылася кароткая гутарка паміж імператарам і тав. Славуцкім.

НА КАНФЕРЭНЦЫІ КОМСАМОЛА СТАЛІНСКАГА РАЁНА

На ранішнім пасяджэнні 2-й канферэнцыі ЛКСМБ Сталінскага раёна горада Менска ўчора прадаўжаліся спрэчкі. З 103 запісаўшыхся далегатаў выступіла больш паловы. Спрэчкі паказалі, што ў раённай арганізацыі на важнейшых участках работы не ліквідаваны яшчэ вынікі шкодніцтва, якое праводзілі ворагі народа, пралезшыя ў кіраўніцтва арганізацыі.

Спрэчкі паказалі, што няма яшчэ большэвіцкай барацьбы ў радзе арганізацый па ачышчэнню комсамольскіх радоў ад ворагаў народа і іх пасобнікаў, няма сапраўднай барацьбы за арганізацыю палітычнага выхавання комсамольцаў і несаюзнай моладзі. Новае кіраўніцтва райкома комсамола недастаткова паварочваецца да вырашэння гэтых пытанняў.

Канферэнцыя прызнала палітычную лінію райкома комсамола старога склала няправільнай і работу дрэннай.

На вячэрнім пасяджэнні пачалося абмеркаванне кандыдатур для тайнага галасавання ў склад райкома.

Вечарам-жа адбылася сустрэча дэлегатаў канферэнцыі з артыстамі Дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Выканаўцы дэлегаты сустрэлі вельмі цёпла.

Сёння на канферэнцыі з 10 гадзін раніцы — далейшае абмеркаванне кандыдатур для тайнага галасавання ў склад райкома.

130 ГАДЗІН У БЕСПАСАДАЧНЫМ ПАЛЁЦЕ

Дырыжабль «СССР В-6», які накіраваўся ў працяглы беспасадачны палёт раніцай 29 верасня, 4 кастрычніка вярнуўся ў Маскву. Дырыжабль пратрымаўся ў паветры 130 гадзін 27 мінут. За гэты час ён праляцеў каля 5.000 кіламетраў. Заканчваючы свой гістарычны далёкі беспасадачны палёт, дырыжабль «СССР В-6» прайшоў над сталіцай і зрабіў некалькі прывітальных кругоў. Вялізная маса людзей, што сабраліся на полі аэрадрома, горача вітала слаўных паветраплавацеляў.

Экіпаж дырыжабля, пад каманданнем тав. Панькова, бліскуча скончыўшы беспасадачны 130-гадзінны пералёт, перакрыў усе вядомыя рэкордныя палёты.

МАТЧ БАТВІНІК—ЛЕВЕНФІШ

МАСКВА, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). 5 кастрычніка ў 6 гадзін вечара ў вялікай аўдыторыі Політэхнічнага музея пачнецца матч на шахматнае першынства СССР паміж М. М. Батвінікам і Г. Я. Левенфішам. Галоўны суддзя матча — тав. Н. В. Крыленка.

Ігра будзе адбывацца 5, 7, 9, 11 і 13 кастрычніка.

З кастрычніка ў Маскву прыехаў гросмейстэр — ордэнаносец М. М. Батвінік. 4 кастрычніка прыязджае чэмпіён краіны па шахматах Г. Я. Левенфіш.

УСЕАГУЛЬНЫ РАБОЧЫ САЮЗ ПАДТРЫМЛІВАЕ ЎРАД НЕГРЫНА

ВАЛЕНСІЯ, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). Нова выбраны выканком Усеагульнага рабочага саюза (ВРС) звярнуўся з адозвай да ўсіх членаў ВРС, а таксама да ўсяго іспанскага народа. У адозве ўказваецца, што выканком будзе ў першую чаргу імкнуцца да падтрымання адзінства. У адпаведнасці з гэтым выканком абяцае ўраду Негрына безагаворачнае падтрыманне і заяўляе, што будзе ўсямерна змагацца за адзінства ў радах усеагульнага рабочага саюза.

ПАЎСТАННЕ СЯЛЯН У ФАШЫСЦКІМ ТЫЛУ

ПРАГА, 3 кастрычніка. (БЕЛТА). Як паведамляе газета «Соцыял-дэмакрат» са слоў звярнуўшыхся з Іспаніі асоб, у тылу ў Франко адбылося буйнае паўстанне сялян правінцыі Балахос і Уэльва супроць мяжэнікаў і інтэрвентаў. Гэтым і выклікана распараджэнне Франко аб поўным закрыцці іспана-партугальскай граніцы ў правінцыі Уэльва.

АНГЛА-ФРАНЦУЗСКАЯ НОТА АБ ІНТЭРВЕНЦЫІ Ў ІСПАНІІ

ПАРЫЖ, 3 кастрычніка. (БЕЛТА). Французскі і англійскі прадстаўнікі ў Рыме ўручылі ўчора італьянскаму ўраду ноту аб інтэрвенцыі ў Іспаніі. Нота ўказвае, што небяспека не будзе адхілена, пакуль не будзе вырашана пытанне аб эвакуацыі замежных войск з Іспаніі і з Балеарскіх астравоў. Англія і Францыя прапануюць склікаць нараду трох дзяржаў. Калі, гаворыцца далей у ноце, на працягу паўнага тэрміна замежныя войскі не будуць адкліканы, Францыя і Англія «будзе цяжка захаваць вернасць палітыцы неўмяшання, якую-б агіду да адмаўлення ад гэтай палітыкі яны ні адчувалі».

Італьянскі міністр замежных спраў Чыано, прымаючы ноту, заявіў, што адказ на яе можа быць дан толькі праз некалькі дзён, бо главы ўрада Мусаліні зараз няма ў Рыме.

ХВАЛЯ ЗАБАСТОВАК У ЗША

НЬЮ-ЁРК, 3 кастрычніка. (БЕЛТА). Забастовачная хваля ў Злучаных Штатах Амерыкі ў бягучым годзе вышэй, чым за ўвесь час пасля сусветнай вайны.

Па афіцыяльных даных, у першай палове 1937 года было 2.512 забастовак, тады як за той-жа перыяд 1936 года — 1077.

Баставала ў першай палове 1937 года 1.198 тысяч рабочых, тады як за ўвесь 1936 год — 789 тысяч.

У пераважнай большасці забастоўкі былі паспяховыя.

Паказальна, што найбольш буйныя і баязлівыя забастоўкі адбываліся ў аўтамабільнай і сталеліцейнай галінах прамысловасці, дзе ўзрос уплыў камітэта вытворчых профсаюзаў.

НА СТАНЦЫІ „ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС"

У раёне Паўночнага полюса набліжаецца палярная ноч. Як паведамілі супрацоўніку «Правды» ў астранамічным інстытуце імя Штэрнберга, на Паўночным полюсе сонца зайшло 25 верасня. Падыходзяць да канца і сумеркі, якія пягнуцца там каля поўмесяца. 11 кастрычніка на полюсе чакаецца поўная палярная ноч.

Адзінай крыніцай святла ў часе палярнай ночы будзе служыць луна. Першыя дні кастрычніка супадаюць з навалуннем. Паколькі луна знаходзіцца зараз у паўднёвым поўшар'і неба, то на Паўночным полюсе яна будзе бачна толькі ў другой палове кастрычніка. 19 кастрычніка ў раёне Паўночнага полюса будзе поўналунне і луна будзе свяціць каля двух тыдняў.

На востраве Рудольфа, дзе знаходзіцца самалёты экспедыцыі Героя Совецкага Саюза тав. Шэвелева, працягласць дня 3 кастрычніка 9 гадзін 22 мінуты. Але дзень там ідзе быстра на ўбыль. 18—19 кастрычніка зімоўшчыкі вострава ўбачаць у гэтым годзе сонца ў апошні раз. З заходам сонца там таксама пачнецца сумеркі, якія, паступова згушчаючыся, пяройдуць у палярную ноч. Поўная цемра на востраве Рудольфа наступіць у пачатку лістапада і скончыцца ў канцы студзеня. Перш чым узыйдзе сонца, зноў будуць сумеркі, якія пачнуцца ў пачатку лютага.

На мысе Бароў, у раёне якога знаходзіцца лятаючая лодка лётчыка Грацыянскага і дзе будзе створана база для палётаў Вілкінса, працягласць дня 3 кастрычніка — 10 гадзін 48 мінут. У гэтым раёне дзень убывае значна марудней. Заход сонца адбудзецца там каля 17 лістапада. Пасля гэтага на мысе Бароў наступяць сумеркі, якія працягнуцца да канца студзеня 1938 года, калі зноў пакажацца сонца.

(«Правда»).

СХОД АКТЫВА НАРКАМЗЕМА СССР

2—3 кастрычніка адбыўся чарговы сход актыва Наркамзема СССР. З дакладам аб плане сельскай гаспадаркі на 1938 год выступіў нам. наркамзема СССР тав. Паскуцкі. Дакладчык расказаў аб буйных поспехах сельскай гаспадаркі ў гэтым годзе. Саўгасы і калгасы атрымліваюць небывалы ўраджай зернавых: у сярэднім па ўсёй краіне 70 пудоў з гектара.

Тав. Паскуцкі асабліва спыніўся на падрыўной рабоце ворагаў народа, якія пралезлі ў радзе месц да кіраўніцтва земельнымі органамі, і на задачы хутчэйшай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы.

Выступаўшыя таварышы падвергілі работу Наркамзема рэзкай крытыцы.

НОВЫЯ КАДРЫ

Сакратар парткома магілеўскай швейнай фабрыкі тав. Алейнікаў успамінае, як ён раней скардзіўся на адсутнасць кадраў, не заўважаючы, як у яго літаральна на вачах раслі і актывізаваліся партыйныя і непартыйныя большэвікі. Калі фабрыцы патрабаваліся людзі на кіруючыя пасады, то партком заўсёды зварачаўся да гаркома партыі з просьбай дапамагчы кадрамі. Між тым, у партыйнай арганізацыі і рабочым калектыве фабрыкі было нямала людзей, вырасшых на рабоце. Аднак, гэтых людзей не бачылі. А не бачылі іх таму, што добра не вывучалі. У рэзультаце атрымлівалася, што нават на пасаду загалчыка цэха або інструктара ленты не маглі знайсці на фабрыцы чалавека.

Так было да таго часу, пакуль справаздачна-выбарчы сход партыйнай арганізацыі не паставіў перад парткомам рэзка пытання аб вырошчванні і высоўванні новых кадраў, як гэтага патрабуе партыя і асабіста таварыш Сталін.

Выконваючы рашэнне партсхода, партком пачаў вывучаць людзей і ў першую чаргу комуністаў. А каб добра іх вывучыць, з імі трэба было шчыльна звязацца. І партком з першых-жа дней сваёй работы пасля выбараў заняўся гэтай справай. Члены парткома пачалі больш наведваць цэхі, змены, брыгады, больш цікавіцца работай кожнага комуніста і беспартыйнага актывіста. Прайшло нямнога часу і партком упэўніўся, што на фабрыцы ёсць вельмі шмат людзей, якіх можна смела высоўваць на кіруючыя пасады.

Калі на фабрыцы ўводзілася новая штатная адзінка—намеснік дырэктара, то партком адразу-ж высунуў на гэту пасаду члена партыі тав. Кавалёву, якая да гэтага працавала інструктарам а не так лёгко была радавой работніцай. Трэба сказаць, што партком не памыліўся. Кавалёва на новай рабоце поўнасцю сябе апраўдвае. Яна карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод рабочых і работніц фабрыкі.

Член партыі тав. Малахоўскі зысунут парткомам на пасаду загалчыка аднаго з цэхаў фабрыкі. Да гэтага ён працаваў радавым рабочым. Тав. Малахоўскі таксама добра спраўляецца з новай работай. Яго цэх па выкананню промфінплана не адстае ад іншых.

З інструктара на начальніка цэха высунут член партыі тав. Каплан. З першых-жа дзён сваёй работы на новым месцы ён энергічна ўзяўся за даручаную яму справу, і ўжо трэці месяц па-большэвіцку кіруе адказным участкам фабрыкі.

Невымыўрыльна выраслі людзі і ў палітычных адносінах. Аб гэтым вельмі ярка сведчыць высоўванне пэлага раду радавых комуністаў на прапагандысцкую работу. Узяць, к прыкладу, Багарод Рахіль. Па вытворчай лініі яе нядаўна высунулі з радавой работніцы на пасаду інструктара, а як комуністку партком не зацвердзіў прапагандыстам комсамольскай сеці. Тав. Багарод добра працуе над сабой, старанна займаецца партыйнай вучобай, актыўна ўдзельнічае ў партыйным жыцці. Зараз яна кіруе комсамольскім гуртком палітграматы. Заняткі вядзе заўсёды жыва, выклікаючы ў слухачоў зацікаўленасць і актыўнасць.

Нядрэнна кіруе комсамольскай школай палітграматы і комуністка Дорзяк Хана. Яна таксама новы прапагандыст.

Аднак, трэба адзначыць, што ўсе гэтыя новыя кадры пры ўсёй іх старанасці працаваць, а таксама адданасці сваёй справе не змогуць паспяхова спраўляцца з пастаўленымі перад імі задачамі, калі ім не будзе аказана неабходная дапамога ў рабоце. Між тым, прыхоўзіцца канстатаваць, што партком і дырэкцыя фабрыкі на гэты бок справы мала зварачаюць увагі.

Р. ФРАЛОЎ.

ЗНІШЧАЮЦЬ ГАТУНКОВАЕ НАСЕННЕ

Пастанова СНК СССР «Аб мерах па паляпшэнню насення зернавых культур» рашуча паставіла задачу аб вытворчасці высокаўраджайнага чыстагатунковага насення. Наша задача—захаваць кожны кілограм гатунковага насення, каб забяспечыць нашы калгасы і соўгасы высокаўраджайным чыстагатунковым насеннем.

Пры праверцы захавання і дакументацыі насення калгасамі ва Узлзенскім раёне выяўлены факты прамога шкодніцтва. Побач з м. Узлой знаходзіцца калгас імя Будзённага, Прысынкаўскага сельсавета. Калгас меў пасевы гатунковай азімай пшаніцы. Гэты пасеў быў на трох асобных участках і розных катэгорый па гатунковасці. Не гледзячы на тое, што калгасу своечасова былі ўручаны акты апрабацыі ён абмалаціў пшаніцу II і III катэгорый разам. Гэтай пшаніцай калгас здаваў хлебапастаўкі. Замест таго, каб у гатункапасведчанні вызначыць пшаніцу трэцяй катэгорыі (паколькі насенне II і III катэгорый змешана) кіраўніцтва калгаса выпісвае хлуслівае гатункапасведчанне, як на пшаніцу II катэгорыі.

Заготзярно ссыпае гэта насенне з пшаніцай II катэгорыі, і такім чынам аказалася, што 404 цэнтнеры пшаніцы II катэгорыі, якая мелася на негаральскім складзе Заготзярна, змешана з трэцяй катэгорыяй.

На негаральскім складзе Заготзярна адсутнічае ўсякая пільнасць пры прыёмцы гатунковага насення. На складзе былі акты апрабацыі ад калгаса імя Будзённага на розныя катэгорыі, але тут нават не патурбаваліся запытаць у здатчыкаў—ці сапраўды здаваемае насенне адпавядае выпісаным гатункадакументам. Загадчык негаральскага пункта Заготзярна Амельянюк безадказна адносіцца да сваёй работы.

Ён не змагаецца за правільнае захаванне гатунковага насення.

На складзе няма актаў апрабацыі па калгасах былога Дзержынскага раёна. Амельянюк не турбуецца, каб пралстазіць іх з дзержынскай канторы Заготзярна.

Непрыпімыя адносіны да вытворчага кантролю за зберажэннем гатунковага матэрыялу праяўляюць узлзенскі райза і МТС. Яны правялі апрабацыю і на гэтым супакоіліся. Аграномы МТС ведалі аб фактах змешвання гатунковага насення, але не прымалі ніякіх мер да гэтых антызяржаўных учынкаў кіраўнікоў пасобных калгасаў.

Так, напрыклад, калгас «Каменка», Каменскага сельсавета, пры абмалоце змяшаў насенне вясковага ячменю II і IV катэгорый з плошчы ў 47 гектараў. У гэтымжа калгасе пражывае ўчастковы аграном Узлзенскай МТС Пятроўскі. Ён не толькі не прыняў мер па захаванню асобных катэгорый але, наадварот, лічыць, што калгас зробіў правільна, па той прычыне, што быццам-бы не меў дастаткова складской плошчы (?!).

Загалчык райза Тарасевіч ні разу не пацікавіўся ходам апрабацыі, не завастрыў увагі агранэсаналу райза і МТС на неабходнасць забеспячэння вытворчага кантролю за абмалотам, захаваннем і дакументаваннем гатунковага насення.

Калгас «Перамога», Сямёнаўскага сельсавета, аддаў 4 гектары малаалкалоіднага лубіну, 4 гектары палявіцы белай, якая была пасеяна для насенных мэт. Аб гэтай шкодніцкай дзейнасці старшыні калгаса Раманоўскага складзен акт і перадан Тарасевічу. Гэтым усё скончылася. Так Тарасевіч пакрывае злачынцаў, якія шкодзяць у насеннай справе.

Факты паказваюць, што ва Узлзенскім раёне не ліквідуюцца вынікі шкодніцтва ў справе захавання гатунковага насення.

Д. БУГАЕЎ.
В. КАРНІЛАЎ.

ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

МНОЖАЦЦА РАДЫ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ СПАБОРНІЦТВА

Канкрэтнымі большэвіцкімі спрасамі калгаснікі перадавых калгасаў Кармянскага раёна адказваюць на заклік перадавых калгасаў аб разгортванні перадкастрычніцкага спаборніцтва. Калгас «Чырвоны колас», Струкачоўскага сельсавета, поўнасцю выканаў план збожжапаставак, натураплаты МТС, заканчвае апрапоўку і здачу ільнапрадукцыі дзяржаве, добра рыхтуе зімоўку для жывёлы. У калгасе арганізован гурток па вывучэнню Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР.

З калгасам «Чырвоны колас» спаборнічае калгас «Правда». Апошні не адстае. Звяно стаханаўкі Моці Макарэнкавай у 2—3 разы перавыконвае нормы па капанню бульбы.

Вялікая работа па падрыхтоўцы да XX гадавіны Кастрычніка разгорнута ў калгасе «Чырвоны партызан», Хляўнянскага сельсавета. Калгаснікі ўзяліся за ўпарадкаванне вуліц. Заканчваецца будаўніцтва вялікага калгаснага клуба і калодзежа.

Трактарысты стаханаўскай брыгады Ушавай Вары, уключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, узорваюць за дзень на трактары па 10—11 гектараў. На сваіх трактарах «ХТЗ» яны ўжо апрацавалі па 957 гектараў і змагаюцца за тое, каб да Кастрычніцкага свята на кожны трактар апрацаваць па 1.300 гектараў.

Лік удзельнікаў перадкастрычніцкага спаборніцтва з кожным днём множыцца.

І. КАВАЛЁЎ.

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ СПАБОРНІЦТВА

На «Гомсельмашы» шырока разгарнулася перадкастрычніцкае спаборніцтва. На цэхавых нарадах стаханаўцаў і ўдарнікаў правяраецца выкананне сацыялістычных дагавораў і ўзятых абавязацельстваў.

У пачатку верасня датэрмінова закончана выкананне плана па выпуску двух машын — малапілкі і сартыроўкі.

Участак майстра Злаціна ў жніўні сабраў 454 машыны «Трыумф» замест плана 325. Па кормазапарніках заданне выканана на 210 проц., конных прыводах—на 190,2 проц.

Стаханаўцы механазборачнага цэха — токар Ісакаў, слесар Яроменка, электразварщык Краўпоў — выконваюць нормы на 200 проц. Маляр Рамановіч павысіла выпрацоўку да 180 проц., Жалезняковў — да 250 проц., столяр Дац — да 300—320 проц. Стаханаўцы заключаюць паміж сабой індывідуальныя дагаворы.

К. МАЛАХАЎ.

ЗА ДАСТОИНУЮ СУСТРЭЧУ СВЯТА

Рыхтуючыся дастойна сустрэць 20-ю гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі, настаўнікі калектыў Каспюковіцкай сярэдняй школы ўзяў на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў.

У мэтах лепшай пастаноўкі работы настаўнікі пастанавілі дабіцца ў гэтым вучэбным годзе ліквідацыі другагодніцтва шляхам індывідуальнай дапамогі адстаючым; дапь магчымасць вучням значна павысіць свае веды. Настаўнікі абавязаліся працаваць над сабою, над падняццем сваёй кваліфікацыі.

Вучні гэтай школы ўключыліся таксама ў перадкастрычніцкае спаборніцтва на добрую адзнаку. Апрача таго, дзеці рыхтуюць да свята сваю самадзейнасць. Пад кіраўніцтвам настаўніка А. Н. Букініча ўжо арганізован гурток з 35 чалавек. Праведзена пяць рэпетыцый, на якіх вывучаны такія песні, як «Песня пра Сталіна», «Лён», «Гармонь» і іншыя.

А. М. МАРГЕЛАЎ.

СТАХАНАЎСКІЯ НОРМЫ

На агульных сходах калгаснікаў Старобінскага раёна шырока абмяркоўваецца зварот калгаснікаў сельскагаспадарчых арцелей імя Дзержынскага і «Чырвоны хлебароб» аб разгортванні перадкастрычніцкага спаборніцтва. Калгаснікі бяруць на сябе канкрэтныя самаабавязацельствы і паспяхова іх выконваюць.

У калгасе «Перамога», Пагосцкага сельсавета, калгасніца Івашкевіч Зоня выконвае за дзень 0,21 гектара бульбы, пры норме ў 0,06, выконваючы, такім чынам, сваю норму на 350 проц. У 2—3 разы выконваюць нормы па капанню бульбы калгасніцы Ліза Пятровіч, Ядвіга Суднік і Галя Астрэйка.

Рэкордныя нормы выпрацоўкі па капанню бульбы даюць калгасніцы калгаса імя Гікало, Чыжэвіцкага сельсавета, Маня Бараноўская, Стэфа Некрашэвіч і Ганна Бараноўская. Пры норме ў 5 сотых га, яны выконваюць за дзень па 20 сотых га бульбы. Паказваюць яны ўзоры стаханаўскай працы і па трапанню ільну.

К. ГРАМАКОЎСКІ.

Перадкастрычніцкае соцспаборніцтва ў калгасах Віцебскага раёна. НА ЗДЫМКУ: старыкі стаханаўскай брыгады тав. Аляксеенка калгаса «Звязда» (злева направа): Д. Т. Бухаўцоў — 82 гады, брыгадзір П. І. Аляксеенка і К. І. Іваноў — 77 год падпісваюць соцдагавор, заключаны з брыгадай тав. Карнача.

Фото Лупейка (БСФ).

Разбуральнік калгаса

Старшынёй калгаса «Чырвоны селянін», Асавецкага сельсавета, Петрыкаўскага раёна, працуе Воўк Цімох. Уся яго дзейнасць накіравана на падрыў калгаснай гаспадаркі.

Яшчэ ў 1932 годзе пры яго актыўным удзеле быў развален калгас «Чырвоны селянін».

У 1934 годзе, па патрабаванню сялян вёскі Турбінка, зноў арганізавалі калгас пад той самай назвай. Намеснікам старшыні калгаса пралез Воўк Цімох. Тут ён працягвае сваю падрыўную работу па развалу калгаса. За адну толькі зіму ў рэзультаце яго варожай дзейнасці загінула семера коней.

Калі восенню ў 1935 годзе калгаснікі парашылі прадаць дзяржаве тры тоны збожжа, Воўк Ц., загітаваўшы некалькі жанчын, не дапусціў адзезці збожжа. Аб гэтым варожым учынку Воўка Ц. веталі раённыя арганізацыі, але, на дзіва, бясклопатна адносіліся да гэтага. Тады вораг яшчэ больш асмялеў.

Вясной гэтага года старшыня калгаса «Чырвоны селянін» быў камандзіраван райкомам партыі на вучобу ў Магілеў ва Ўсебеларускую калгасную школу. Старшынёй калгаса становіцца Воўк Цімох. На гэтай пасадзе ён сваю варожую дзейнасць накіроўвае на парушэнне статута сельскагаспадарчай арцелі. Для таго, каб знізіць і абяспэніць кошт прадукта, ён напалову зніжае норму выпрацоўкі. У гэтым Воўку дапамагае яго прыяцель, старшыня рэзізійнай камісіі, сын кулака — Галеня Юльян. Разам з ім Воўк дабіваецца на агульным сходзе калгаснікаў рашэння аб надзяленні кожнага ўчасткам сенажаці ў 0,60 га.

Учоту ў калгасе няма. Вясной Воўк Ц. прадаў тры тоны бульбы, а грошы прапіў з сваёй кампаніяй. У часе сенаўборкі ён прадаў 4 вазы сена, грошы не запрыходаваў.

Калгасную маёмасць Воўк разбазарвае. У гэтым годзе ён аддаў свайму брату — Нікадзіму — калгаснага каня з возам і збруяй, а калгаснікам «растлумачыў», што брат украў каня.

Дзейнасць ворага астаецца беспакаранай. Некалькі разоў сельсавет сігналізаваў у РВК і райза аб злачынствах Воўка Ц. Аднак да гэтага часу мер ніякіх не прынята.

Бясклопатнасць раённых арганізацый нельга расцэньваць інакш, як патуранне ворагу.

А. МАРЦІНОВІЧ.

Варожыя справы Патоцкага

Загадчык паштовага аддзялення Нікалаеўскага сельсавета, Віцебскага раёна, Патоцкі Карп займаецца злачыннымі справамі. Ён сістэматычна ўскрывае пісьмы (простыя і заказныя), чытае іх або зусім знішчае. Падпіску на газеты ён правальвае і агітуе, каб калгаснікі зусім іх не выпісвалі.

Патоцкі акружыў сябе чуждымі людзьмі і праводзіць антысавецкую работу ў сельсавеце. У часе грамадзянскай вайны ён забяспечваў бандытаў зброяй.

Аб усіх гэтых фактах пісалася ў «Віцебскім пролетары», але Патоцкі мае сваіх заступнікаў у паштовай канторы Віцебска. Ці не пара выкрыць канчаткова гэтага аферыста і яго заступнікаў?

СВЯЗІСТ.

Чаму нас не накіроўваюць на работу?

Мы даўно марылі стаць выхавальніцамі нашай совецкай дзетвары. Даведаўшыся аб адкрыцці ў Оршы аднагадовых дашкольных курсаў, мы з радасцю пайшлі туды вучыцца. 150 дзяўчат вучыліся на курсах і атрымлівалі дзяржаўную стыпендыю.

29 ліпеня скончыўся наш навучальны год. Кожная з нас хацела хутчэй атрымаць накіраванне на работу, аддзякаваць дзяржаве за выдаткаваныя на нас сродкі. Але мы былі вельмі здзіўлены, калі даведаліся, што толькі 50 чалавек са скончыўшых курсы накіразаны на работу. Астатнія 100 чалавек з дыпломамі і званнем кіраўнікоў дзіцячых садоў да гэтага часу яшчэ не накіраваны ў дашкольныя ўстановы.

Усім ясна, што работы ў нашай краіне хопіць усім. Мы таксама ведаем, што ў нас вялікі недахват кваліфікаваных дашкольных выхавальніц. Справа заключаецца толькі ў тым, што ў Наркомасветы яшчэ не ліквідавалі ўсе рэшткі шкодніцтва. Мы шмат разоў пісалі аб гэтым у Наркомасветы, але адказу не атрымалі.

КАРЖАНЕЎСКАЯ ЛІДА, СЛЕПЧЫК ОЛЬГА, ВІШНЯКОВА ЗОЯ, ПАРЧЭЎСКАЯ СОФ'Я.

Хуліганы асталіся непакаранымі

Месяц таму назад мая цяжарная жонка Антаніна Кротава ехала з мясцэчка Каспюковічы дамоў на грузавой машыне з Забычанскага віннага завода. Разам з ёю ехалі п'яныя бухгалтар Сітнікаў і намеснік дырэктара вінзавода Трызна.

Сітнікаў, жадаючы адпомсціць мне за выкрыццё яго сувязі з варожымі элементамі, пачаў здзекавацца з цяжарнай жанчыны — лаяць, штурхаць і біць яе. Гэтаму дапамагаў п'яны Трызна. Хуліганскія здзекі прадаўжаліся, пакуль не ўмяшаўся шофер.

Жонка прыехала дамоў ледзь жывая. У яе пачаліся дачасныя родавыя схваткі. Яе ў вельмі цяжкім становішчы завезлі ў каспюковіцкую больніцу. Хуліганы-ж асталіся без пакарання, не гледзячы на тое, што каспюковіцкая раённая газета патрабавала прыняцця мер у адносінах Сітнікава і Трызны.

Калі я нядаўна асабіста звярнуўся па гэтай справе да раённага пракурора Шабаліна, дык ён здзеклівым тонам адказаў:

— Чаго ты клапоцішся. Наадварот ты павінен быць удзячным, што жонка дачасна родзіць сына, ці дачку.

Абураны гэтымі бесчалавечымі адносінамі, прашу рэдакцыю «Звязды» дапамагчы мне прыцягнуць хуліганаў і іх патуральнікаў да адказнасці.

І. Н. КРОТАЎ,
дырэктар соўгаса «Забычанне».

АД РЭДАКЦЫІ. Рэдакцыя «Звязды» зварачае ўвагу пракуратуры рэспублікі на агіднейшы ўчынак хуліганаў Сітнікава і Трызны і на злачыннае папіранне совецкага закона раённым пракурорам Шабаліным. Патрабуем неадкладнага расследвання фактаў і дастойнага пакарання раз'юшаных хуліганаў і іх патуральнікаў.

Беспадстаўна знімаюць працадні

З 1 студзеня і па 3 сакавіка гэтага года я працаваў конюхам у сваім калгасе імя Калініна, Ленінскага сельсавета, Чачэрскага раёна. Разам з другім конюхам, Антосем Чарняўскім, мы даглядалі па 15 коней кожны і адначасова па чарзе вывалі збрую. За гэта нам павінны былі налічваць па 49 працадзён у месяц. Але Чарняўскаму налічвалі 49 працадзён, а мне толькі 39. Колькі разоў я ні звяртаўся да бухгалтара калгаса Макарэнкі і брыгадзіра Акінчыца Базыля, каб яны ўладзілі гэту справу, але налічэнне працадзён увесь час адцягвалася.

Я вымушан быў пакінуць работу конюха. За гэта мне старшыня калгаса Драбушэўскі самавольна, без згоды агульнага схода калгаснікаў, зняў яшчэ 30 працадзён. Гэта грубае парушэнне статута сельгасарцелі Драбушэўскі лічыць зусім нармальным.

І. В. МАШУЦІН.

У БЕЛДЗЯРЖСПІРЦЕ ПА-РАНЕЙШАМУ ТВОРАЦЦА АГІДНАСЦІ

На працягу 1937 года «Звязда» тры разы пісала аб «справах» Белдзяржспірта. Гэтыя сігналы былі ўпаўне дастатковы для таго, каб партыйная арганізацыя траста неадкладна ўзялася за ачыстку спіртазаводаў і апарата трэста ад ворагаў народа.

Але ў трэсце сустрэлі гэтыя вы тупленні ў штыхі. Створаная камісія па расследванню ўсіх матэрыялаў «прапавала» два месяцы і зараз самаліквідавалася. Па гэтаму-ж пытанню ў жніўні адбыўся сход актыва спіртазаводаў. Але становішча ў трэсце зусім не змянілася.

На спіртазаводах па-ранейшаму арудуюць шкоднікі, жулікі, прахалзімцы. Яны разбураюць прадпрыемствы, раскрадваюць сотні тысяч рублёў дзяржаўных грошай, здзекваюцца над лепшымі людзьмі. У рэдакцыю прадаўжаюць паступаць дзесяткі пісем аб актыўным дзеянні ворагаў народа, аб іх разлагаючай рабоце.

Кіраўнікі трэста Кузмічоў і Куноўскі абараняюць ворагаў народа, перамяшчаюць шкоднікаў з аднаго завода на другі, старэюцца іх рэабілітаваць перад партыйнымі і совецкімі арганізацыямі і ўсяляк спрыяюць іх варожай дзейнасці.

На эмануілаўскім заводзе (Крычаўскі раён) доўгі час арудавала шайка ворагаў на чале з дырэктарам Немолякіным. Уся гэтая група займалася контрраволюцыйнымі справамі, збеннямі рабочых і калгаснікаў.

У лютым г. г. фурман Труханаў не лагадзіў свайму дырэктару. Разгневаны Немалякін не пусціў фурмана салзіцца ў павозку, а прымусіў яго бегчы за санямі 7 кілометраў. Выбіўшыся з сіл, Труханаў упаў на дарозе, ляжаў у беспрытомнасці, пакуль яго не падабралі міма ехаўшыя калгаснікі.

У гэтым-жа месяцы сабака Немалякіна дзесьці прабіла бок. Дырэктар даходзіць да такой нахабнасці, што вывешвае на тэрыторыі завода аб'яву: «Хто ўкажа мне злачынцу раніўшага сабаку то таму даю 100 рублёў узнагароды, а з злачынцам я распраўлюся сам».

Выконваючы загад дырэктара, загадчык транспартам Ступнін В. Ф. наўмысла запірае ў барэзяной гарачай яме рабочага-стаханаўца Лагунову Марыю. І толькі выпадкова праходзіўшы міма рабочы Купаеў яе вызваліў. Лагунову выпягнулі з ямы ў цяжкім становішчы, поўабваранай.

Збіеннем рабочых займаліся сабутыльнікі Немалякіна Анкудоў і тэхнарук Соркін.

Вытворчая праграма завода ў 1936 годзе сарвана. Прадпрыемства мела на 160 тысяч руб. страт. З-за шкодніцкага догляду пала 10 лепшых коней, у тым ліку 2 племянных жарабцы, коштам у 5 тысяч рублёў кожны.

Немалякін быў песна звязан з ворагамі народа, разам з імі п'янствааў.

Кузмічоў атрымоўвае ад Немалякіна ў падарунак ручны гадзіннік, куплены за кошт завода. Гэты-ж Немалякін піша рапарты: «Геніяльнаму кіраўніку Кузмічову»... І пасля таго, як Крычаўскі райком партыі выносіць Немалякіну суровую вымову з папярэджаннем, Кузмічоў перакідвае яго дырэктарам на стралічаўскі спіртазавод (Хойніцкі раён), на той самы завод, дзе быў выкрыт жулік, прахалзімец Лісоўскі. Гэта называецца «аздараўленне» прадпрыемства.

Лісоўскі разваліў стралічаўскі завод. За 1936 г. завод даў 370 тысяч рублёў страты, за першы квартал 1937 г.—174 тысяч рублёў. Раскрадзена 28 тон ячменю. Разам з сваім шурынам-глабухам Калубовічам Лісоўскі займаўся жульніцкімі махінацыямі.

Для таго, каб не папасці ў немілась начальству, яны адвозяць Кузмічову свіную тушу вагой у 12 пудоў.

А на заводзе яны прадаўжалі свае шкодніцкія справы. Паступаючую з вытворчасці барду, гэта шайка выпускала ў канаву, у той час, калі соўгасы і калгасы раёна адчувалі патрэбу ў кармах для жывёлы.

Кузмічоў тры разы прыязджаў на гэты завод для «ўрэгулявання» злачынных прадзелак. Ён увесь час стараўся падвесці гэтыя шкодніцкія справы пад тэхнічныя непаладкі. У ўзнагароду ён атрымліваў ад Лісоўскага падарункі (парасяты, мала і інш.). Калі Хойніцкі райком партыі выключыў Лісоўскага з партыі, Кузмічоў стараўся яго адстаяць. А зараз аплаціў яму па 700 руб. за 3-месячны «вымушаны» прагул і прызначыў тэхнарукам на обольскі завод (Сенненскі раён).

Кузмічоў стараецца захоўваць «кадры», выкрытых прахалзімцаў і жулікаў.

Загадчык сыравінным цэхам піраўшчага завода (Жлобінскі раён) Раманаў займаецца самазабеспячэннем. За сістэматычныя кражы Раманава звальняюць з завода, але Кузмічоў аднаўляе яго на старым месцы.

Доктаравіцкі спіртазавод (Капыльскі раён) даў страты ў 1936 годзе 87 тысяч рублёў. Выхад спірту быў зусім ніякі (58 дэкалітраў з адной тоны крухмалу замест 62 па норме). За 1936 г. завод уплаціў чыгунцы за прастой вагонаў 20 тысяч рублёў.

Дырэктарскі фонд ў 200 тысяч рублёў выдаткаван на пабудову канторы і кватэры бухгалтара, у той час, калі рабочыя жывуць у вельмі дрэнных умовах. Загалчык сталовай раскрадае грошы, аблічвае калгаснікаў пры пакупцы кармоў.

Для расследвання гэтых фактаў Белдзяржспірт і ЦК саюза спіртавогачнай прамысловасці пасылае некалькі раз сваіх работнікаў, але агіднасці і да гэтага часу паўтараюцца.

Якія-ж меры прымаюць кіраўнікі трэста для ліквідацыі вынікаў шкодніцтва на спіртзаводах, дзе былі выкрыты органамі НКВД ворагі народа?

На палажэвіцкім заводзе (Старадарожскі раён) быў выкрыт вораг народа. Кузмічоў пасылае тулы новага дырэктара Зенчына, які фактычна прадаўжае шкодніцкія справы ранейшага дырэктара. Капельную ўпяпляюць апілкамі і торфам што пагражае пажарам. З 5 жніўня завод 5 раз гарэў. Для далейшага лапярэджання ад пажараў Зенчын дае дырэктыву, каб добры сухі торф вывазіць з двара завода на сенакос. На справе-ж гэта накіравана па тое, каб пакінуць завод без паліва.

Помтэхнарука Лапацін выпусціў у рэчку 600 вёдраў брагі са спіртам. Гэту справу замялі. Будучы дырэктарам Клімавіцкай МТС Зенчын праваліў работу, быў пад судом і знят з работы. У Кузмічова-ж ён знайшоў цёплае мястэчка.

Ворагі народа здзекваюцца над стаханаўцамі, свавольнічаюць, без усякай прычыны звальняюць рабочых з вытворчасці, расправяюцца з нездаволенымі і з тымі, хто перашкаджае ім ў іх шкодніцкай рэбоце.

Дырэктар коцпеўскага спіртазавода (Дрыбінскі раён) Сенькоўскі злосна расправяецца са сваімі крытыкамі. Нядаўна ён зволіў вартаўніка Грэка, які на сходзе выкрываў раскрадальнікаў зярна і спірту. За такія-ж «грахі» былі зволены загадчык сталовай Курносаў, вартаўнік Пімена.

Сенькоўскі груба парушае законы ўрада. Стаханаўцаў Рэдкевіч Веру і Чырвонаву Акуліну не дапусціў пасля дэкрэтыўнага вольнасці да работы. У стаханаўца Калібертава Фёдара адняў сядзібу.

У час менінгітнага каранціна на тэрыторыю завода быў адкрыт доступ для праезду злачынцам зярна і бульбы, ад чаго ў суседніх калгасах паявіліся захворванні коней менінгітам. З-за школніцкай бязгаспадарчасці на заводзе пала 6 коней.

Сенькоўскі разам з загадчыкам гаспадаркі Казловым падрабляюць рахункі на 1000 рублёў, а грошы дзеляць паміж сабой. За апошні час завод гарэў тры разы, а дырэктар у гэты час п'янствааў. Гэты-ж дырэктар прытуліў у сябе на заводзе нейкага Чэнькова Кірылу, які ўкрываецца ад адбыцця пакарання і расшукваецца органамі міліцыі.

Пасля праведзенага рамонту спіртазаводаў, на які затрачана сотні тысяч рублёў, амаль усе пушчаны ў эксплаатацыю. Але-ж з дакладу ў дакладу Белдзяржспірт выконвае свой план толькі на 50 проц. Выхад спірту зусім ніякі (59—60 дэкалітраў—замест 61—62).

Кіраўнікі трэста ўстойваюць ад грамадскасці велізарныя раскрадванні і растраты, якія адбываюцца на заводах. У 1934 годзе яны складалі 427 тысяч рублёў, у 1935 г.—541 тысячу, у 1936 г.—670 тысяч. Кузмічоў пайшоў па лініі спісвання растрат і гэтым стараецца ўтаіць ад дзяржавы ўсе шкодніцкія справы на заводах. У 1936 годзе ён спісаў 606 тысяч руб.

На ўсебеларускім з'ездзе саюза работнікаў спіртаводачнай прамысловасці, які гэтымі днямі закончыўся, амаль усе стаханаўцы і рабочыя ў сваіх прамовах прыводзілі дзесяткі прыкладаў раскрадванняў і растрат, якія твораццa ў іх на прадпрыемствах. Выступіўшы тут-жа з прамовай дырэктар траста Кузмічоў зваліў усю віну за шкодніцтва на... ЦК саюза, на нізавыя партыйныя і профсаюзныя арганізацыі. А ён—Кузмічоў, як аказваецца, зусім не прычым.

Разам з Кузмічовым развальвае спіртаводачную прамысловасць рэспублікі тэхнарук Куноўскі.

Куноўскі — сын буйнага кулака. Бацька яго меў 60 га зямлі, 6 коней, 10 кароў і розны сельскагаспадарчы інвентар, выключаўся з калгаса за разлагаючую работу.

Працуючы на гаршчаўчынскім заводзе, Куноўскі трымаў 8 кароў, 20 свіней, 2 коней. Калі на гэтым заводзе была выкрыта школніцкая група, ён разам з Кузмічовым прыклаў усе намаганні, каб выгаразіць гэту шайку.

Начальнікам аддзела сыравіны трэста працуе Іваноў—сын кулака, быў судзім за растрату 12 тысяч рублёў, быў звязан з ворагамі народа.

Дзейную пазіцыю заняў у адносінах Белдзяржспірта Наркамхарчпром. Тав. Раксін—намеснік наркома—гаворыць, што наркамат толькі з'яўляецца кантралёрам у адносінах да траста, але-ж, з прыведзеных фактаў відаць, што і гэтыя функцыі не выконваюцца Раксіным. Ён спакойна наглядае, як развальваецца гэта галіна харчовай прамысловасці БССР.

Партыйная арганізацыя траста і не сакратар тав. Пікус не могуць не несці адказнасці за ўсе справы, якія прахоўзяць у іх на вачах. Да рэчы, Пікус з'яўляецца намеснікам дырэктара і ён увесь час працуе разам з Кузмічовым. На сігналы друку Пікус зусім не рэагуе і стараецца адмаўчацца.

Зусім незразумела, чаму гарадскі камітэт партыі, маючы столькі сігналаў друку аб «дзейнасці» Кузмічова, да гэтага часу не прымае ніякіх мер да аздараўлення траста?

І. ТУРЗЦКІ,
І. БАРАНОЎСКІ.

РЭСПУБЛІКА РЫХТУЕЦЦА ДА ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР

ГУРТКІ ПА ВЫВУЧЭННЮ ПАЛАЖЭННЯ АБ ВЫБАРАХ

Шырокія масы працоўных Палесся актыўна рыхтуюцца да надыходзячых выбараў у Вярхоўны Совет СССР. У мястэчках, калгасах, вёсках і на прадпрыемствах ідзе глыбокае вывучэнне Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР. У раёнах Мазыршчыны працуюць 939 гурткоў, у якіх 25.988 чал. вывучаюць выбарчы закон. Падрыхтавана некалькі сотень чалавек з партыйнага актыва і сельскай інтэлігенцыі, якія стануць у бліжэйшыя дні арганізатарамі і кіраўнікамі дадаткова арганізуемых гурткоў.

Ва ўсіх раёнах прайшлі гутаркі, сходы, палітдні і палітмасоўкі, прысвечаныя Сталінскай Канстытуцыі і выбарчаму закону. Усяго гутарак і сходаў праведзена па акрузе 1.087, на якіх прысутнічала 105.139 чалавек. Палітдзён, па даных толькі трох раёнаў, праведзена 145, з ахопам 18.249 чалавек. Усяго сходамі, гутаркамі і палітднямі было ахоплена 122.816 чалавек. Ва ўсіх раёнах склікаліся пашыраныя пленумы райвыканкомаў, у якіх прымала ўдзел 495 чалавек. Таксама па ўсіх сельсоветах акругі праведзены пленумы з удзелам актыва, у якіх прымала ўдзел 7.129 чалавек.

Сходы рабочых, служачых, калгаснікаў паказалі вялікую зацікаўленасць і актыўнасць працоўных. У радзе прадпрыемстваў, сельсоветаў задаваліся працоўнымі сотні пытанняў. Але-ж, трэба прама сказаць, становішча агітацыйнай работы па папулярызацыі «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» сярод працоўных мас, асабліва сярод неарганізаванага насельніцтва і на вёсцы, астаецца яшчэ яўна нездавальняючым. Трэба яшчэ зельмі многа папрацаваць, каб выбарчы закон быў даведзен да ўсведамлення кожнага рабочага, служачага, калгасніка і аднаасобніка. Асабліва дрэнна пастаўлена агітацыйная работа ў Петрыкаўскім і Ельскім раёнах, якія яўна адстаюць як па колькасці арганізаваных гурткоў, так і па колькасці ўцягнутых прапоўных у гэтыя гурткі і па вывучэнню «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР». Многія гурткі працуюць нерэгулярна, з вялікімі перабоямі. Як прыклад, можна прывесці Скрыгалаўскі сельсовет, Петрыкаўскага раёна, дзе нават арганізаваныя 10 гурткоў працуюць нерэгулярна.

У сучасны момант у раёнах праводзіцца вялікая работа па арганізацыі выбарчых участкаў. Па 116 сельсоветах і горсоветах акругі намечана арганізаваць 287 выбарчых участкаў. Але паасобныя раёны, як Мазырскі (старшыня т. Буякоў), Даманавіцкі (ч. в. аб. старшыні т. Галавачэнка), несур'ёзна адносяцца да арганізацыі выбарчых участкаў з тым, каб выбаршчыкам скласці сапраўды добрыя ўмовы ажыццяўлення сваіх выбарчых правоў.

Акрвыканкомам прымаюцца меры для ажыццяўлення гэтых недахопаў. Па 60-ці сельсоветах акругі ўжо складзены спісы выбаршчыкаў, заканчваецца складанне спісаў па астатніх сельсоветах. Адным з адмоўных бакоў у рабоце райвыканкомаў, сельсоветаў акругі з'яўляецца тое, што секцыі і дэпутацкія групы ў калгасах і на прадпрыемствах слаба яшчэ ўцягнуты ў падрыхтоўчую работу да выбараў у Вярхоўны Совет.

Да ліквідацыі наяўных буйнейшых недахопаў днямі склікаецца пленум акрвыканкома, які абмяркуе ход падрыхтоўчай работы да выбараў у Вярхоўны Совет СССР і намеціць канкрэтныя мерапрыемствы.

Старшыня Мазырскага акрвыканкома РАМАНЕНКА.

СКЛАДАЮЦЦА СПІСЫ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Ва ўсіх сельсоветах Аршанскага раёна праведзены пленумы з удзелам актыва па абмеркаванню новага выбарчага закона. Прэзідыум райвыканкома запвердзіў па раёну 51 выбарчы ўчастак. Па Якаўлевіцкаму, Крывінскаму сельсоветах і Асінторфу будуць арганізаваны тры выбарчыя ўчасткі.

Асобна арганізавана 12 выбарчых участкаў па чыгуначнаму пасёлкаваму совету станцыі Орша. Па гораду намечана 16 участкаў.

На днях праведзены інструкцыйныя нарады старшынь і сакратароў сельсоветаў па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет. Па 21 сельсовету раёна, а таксама па чыгуначнаму пасёлку прыступілі да складання папярэдніх спісаў выбаршчыкаў.

Райком партыі арганізаваў семінар прапагандыстаў на 36 чалавек. Зараз у раёне працуюць 197 гурткоў. У паравозным дэпо ахоплена гурткамі 800 рабочых.

М. ГУРЗВІЧ.

ПРАПАГАНДА ВЫБАРЧАГА ЗАКОНА ПА РАДЫЁ

Для папулярызацыі Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона Беларускі радыёкамітэт праводзіць цыкл актуальных радыёперадач.

5 кастрычніка ў 18 гадзін 30 мінут праз радыёстанцыю імя Соўнаркома БССР будзе трансліравацца запісаны на тонфільм (светавы плёначны запіс) гістарычны даклад таварыша Сталіна на Надзвычайным VIII Усесаюзным з'ездзе Саветаў «Аб праекце Канстытуцыі СССР». 6 кастрычніка ў 20 гадзін будзе пераладавацца запіс прамовы тав. Молатава. Гэтыя перадачы будуць трансліравацца ўсімі радыёвузламі БССР.

8 кастрычніка ля мікрафона выступяць дэпутаты і старшыні некаторых гарадскіх і сельскіх саветаў. Яны раскажуць слухачам аб падрыхтоўцы саветаў да надыходзячых выбараў. У гэты-ж дзень налажваецца таксама літаратурна-музыкальны вечар з выступленнямі пісьменнікаў і паэтаў і канцэртам па заяўках дэпутатаў.

124 ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКІ

Акрвыканком і райвыканкомы пры дапамозе акругкома і райкомаў партыі арганізавалі па ўсёй акрузе гурткі па вывучэнню Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР і Сталінскай Канстытуцыі. На 23 верасня гэтых гурткоў налічвалася 708. Новы выбарчы закон абмяркоўваўся ва ўсіх калгасах і населіўчах. Праведзены спецыяльна па гэтаму пытанню пленумы сельсоветаў, а таксама нарады старшынь і сакратароў сельсоветаў і раённага актыва. У галіне масавай работы па падрыхтоўцы насельніцтва да выбараў былі праведзены агульныя сходы ў калгасах, на прадпрыемствах і ва ўстановах.

У Лепельскім раёне для дэтальнага вывучэння Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у вярхоўныя органы ўлады арганізавана 209 гурткоў. Для ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод выбаршчыкаў арганізавана 145 школ.

Па Ушацкаму раёну для вывучэння Палажэння аб выбарах створана 206 гурткоў у калгасах, установах і на прадпрыемствах, з ахопам каля 8.500 слухачоў.

У Бягомльскім раёне арганізавана 209 гурткоў, а ў Чашніцкім больш 300. Па аднаму толькі горсовету налічваецца 69 новаарганізаваных гурткоў.

Кіраўнікамі ўсіх гурткоў вылучаны людзі з партыйна-комсамольскага і совецкага актыва, а таксама з актыва настаўнікаў. Праўда, не ўсе арганізаваныя гурткі працуюць добра. Назіраецца дрэннае наведванне. Па Ушацкаму раёну (Завегельскі сельсовет) гурткі зусім яшчэ не прыступілі да работы. Дрэнна працуюць гурткі па гораду, створаныя для неарганізаванага насельніцтва. Для кансультацыі па ўсіх пытаннях вылучаны члены прэзідыума РВК і члены бюро райкома партыі.

На пасяджэнні прэзідыума акрвыканкома была ўжо заслухана справаздача двух раёнаў — Лепельскага і Бягомльскага аб падрыхтоўцы да выбараў. Праведзена шпаведная работа па арганізацыі выбарчых участкаў. Усяго выбарчых участкаў па акрузе арганізавана 124. Па Лепельскаму 31, па Бягомльскаму 23, па Ушацкаму 34, Чашніцкаму 30 і па горсовету 6. У кожным выбарчым участку падабраны выбарчыя пункты, адведзены адпаведныя памяшканні.

Аднак пры разбіўцы на выбарчыя ўчасткі былі дапушчаны вялікія памылкі. Па некаторых сельсоветах пры разбіўцы на выбарчыя ўчасткі былі не занесены многія населеныя пункты ў спіскі. Напрыклад, па Цялінскаму сельсовету, Чашніцкага раёна, налічваецца 55 населеных пунктаў, а пры разбіўцы запісана 39. Такім чынам, не занесена ў спіскі 16 пунктаў. Па Чарэйскаму сельсовету населеных пунктаў 20, а запісана толькі 17. Па Альшанскаму сельсовету з 47 пунктаў не ўнесена 8.

Трэба адзначыць, што гурткамі ахоплены далёка не ўсе выбаршчыкі. Асабліва гэта датычыць да неарганізаванага насельніцтва. Тут яшчэ не браліся як след за работу. Штодзённай прапагандай Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона намі ахоплена яшчэ невялікая частка насельніцтва. У рэзультаце нашай слабай работы мы маем, што ў некаторых раёнах наглядаюцца класава-варожыя выступленні розных сектанцкіх, контрэволюцыйных груп. Напрыклад, у калгасе «Новы шлях», Глыбанскага сельсовета (Ушацкі раён), сектанцкія элементы ў часе работы гурткоў збіраюць свае рэлігійныя зборышчы, а гэта гаворыць пра тое, што вораг не спіць, і дзе мы не працуем, там ён актыўна дзейнічае.

Асталося вельмі і вельмі мала часу да выбараў. Мы зараз мабілізуем усе свае сілы і энергію, каб наша акруга сустрэла гэты гістарычны дзень добра падрыхтаванай.

В. В. ЛЕДЗЕНЕЎ,
старшыня лепельскага акрвыканкома.

СХОДЫ ЖЫХАРОЎ ВУЛІЦ

За апошні час па Менскаму сельскаму раёну адчуваецца пэўны эрух у падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

На прадпрыемствах, у соўгасах, калгасах, ва ўстановах і ў прамысловых арцелях раёна арганізавана 512 гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР». Гурткамі ахоплена 13.000 працоўных.

Па Астрашыцка-Гарадзецкаму сельсовету працуюць 32 гурткі. Заняткі іх праводзяцца праз кожныя 5 дзён. Кіруюць гурткамі добра падрыхтаваныя настаўнікі і актывісты сельсовета. Некаторыя настаўнікі прымацаваны да асобных хат працоўных. Яны праводзяць агітацыйна-растлумачальную работу сярод хатніх гаспадынь і старыкоў, якія па розных прычынах не могуць наведваць заняткі гурткоў. Для ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці па сельсовету арганізавана 17 школ.

Арганізаваны і працуюць 63 гурткі па вывучэнню Палажэння аб выбарах па прадпрыемствах, ва ўстановах і ў прыгарадных калгасах Дзержынскага горсовета. Каб ахапіць прапагандай выбарчага закона неарганізаванае насельніцтва, па горсовету створаны 24 так званыя дзесяцідворкі. Работу сярод іх праводзяць члены горсовета і настаўнікі. У горадзе па кожнай вуліцы паасобку праводзяцца сходы жыхароў па пытанню аб падрыхтоўцы да выбараў. Зараз горсовет падрыхтоўвае адкрышё ясляў і пакоя маці і дзіцяці з тым, каб даць магчымасць жанчынам, якія маюць малых дзяцей, прымаць удзел у выбарах.

Па калгасах Кайкаўскага сельсовета арганізавана 33 гурткі. Заняткі праводзяцца рэгулярна праз кожныя 5 дзён. У ліку кіраўнікоў гурткоў 8 членаў сельсовета.

Добра арганізавана прапаганда Сталінскага выбарчага закона ў калгасе імя Молатава, Прыгараднага сельсовета. Кожны з настаўнікаў Пятроўшчынскай НСШ прымацаван да 5—6 двароў калгаснікаў, дзе праводзіць гутаркі і вывучэнне Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. Праўленне калгаса забяспечыла гурткі неабходнай літаратурай.

З выключнай зацікаўленасцю вывучаюць працоўныя Сталінскі выбарчы закон. Калгасніца калгаса «Праца» Валахановіч Соня расказвае: — Пры вывучэнні Палажэння аб выбарах, мы многа задаем пытанняў кіраўніку гуртка т. Іванову, адказы атрымліваем ўпаўне вычарпальныя.

У бліжэйшыя дні пачынаюцца справаздачы сельсветаў перад насельніцтвам аб выкананні наказаў выбаршчыкаў. Падрыхтоўка да выбараў у раёне цесна спалучана з разгортваннем перадкастрычніцкага соцспаборніцтва. Многія калгасы поўнасцю ўжо разлічыліся па ўсіх відах дзяржаўных паставак і ў бліжэйшы час завяршаюць сельскагаспадарчыя работы. Калгасы Палгайскага, Абчацкага і Фанідальскага сельсветаў перавыканалі план сіласавання. Поўнасцю падняты са спелішчаў лён па калгасах Гатаўскага, Трасцянецкага і Паланеўскага сельсветаў, прыступлена да апрацоўкі яго і здачы ільнапрадукцыі дзяржаве.

С. ГРЫШЧАНКА.

ВЫБАРЧЫЯ УЧАСТКІ ПРЫ БОЛЬНІЦАХ

У Асіпавіцкім раёне ўзмоцнена разгортваецца работа па складанню спісаў выбаршчыкаў. Да гэтай работы апрача дэпутатаў саветаў прыцягнут актыў настаўніцтва. Запверджаны 45 выбарчых участкаў. Апрача гэтага выбарчыя ўчасткі будуць створаны пры асіпавіцкай і свіслацкай больніцах.

У бліжэйшыя дні па ўсіх прадпрыемствах, калгасах, прамысловых арцелях будуць зроблены даклады па пытаннях: правы і абавязкі грамадзян СССР, становішча працоўных у капіталістычных краінах.

КАЛГАСНІКІ ЎСПАМІНАЮЦЬ ПРА ЦЯЖКАЕ МІНУЛАЕ

ДРЫСА, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). Ля самай граніцы жывуць калгаснікі сельгасарцелі «Правда». Яны адчуваюць сваю асаблівую адказнасць перад соцыялістычнай радзімай, сілу і магутнасць якой яны множаць сваёй штодзённай ударнай работай у калгасе, ваеннай вучобай, большэвіцкай пільнасцю.

Актыўна рыхтуюцца калгаснікі да надыходзячых выбараў у Вярхоўны Совет СССР. У трох гуртках яны дэтальна вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю і выбарчы закон. Тут калгасныя прапагандысты маюць добрых і актыўных памочнікаў у асобе ўдарнікаў абаронай работы—ордэнаносцаў Паўлюкевіча Емельяна і Канюшэўскага Вікенція. За плячыма ў іх вялікі жыццёвы вопыт. І ў групавых гутарках, і на занятках гуртка яны добра тлумачаць калгаснікам сталінскі выбарчы закон, наглядна ілюструючы асноўныя моманты фактамі з мінулага і сучаснага жыцця.

66-гадовы Паўлюкевіч добра памятае царскія парадкі. Ён расказвае як выбіралі валаснога старшыню. Гэта былі не выбары, а здзекі над народам. Ураднік пагражаў, што калі не будуць галасаваць за ўгодных «начальству» кандыдатаў, з зямлі згоніць, сапраўдны ў Сібір. Пускаліся ў ход усе сродкі абману. На губернскі з'езд зноў-такі ехалі памешчыкі, багацеі. Бяспраўнымі, безгалосымі былі працоўныя сяляне.

Гаворачы з гордасцю аб вялікіх правах, заваяваных совецкім сялянствам пад кіраўніцтвам большэвікоў, рабочых, — тав. Паўлюкевіч заканчвае сваю гутарку наступнай заявай:

— У надыходзячых выбарах у Вярхоўны Совет я буду галасаваць за кандыдатаў, якіх будзе выстаўляць комуністычная партыя. Сваё шчасце і радасць, вялікія заваёвы і правы, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі, мы ніколі і нікому не аддамо. Як зеніцу вока будзем ахоўваць совецкую граніцу. Я ўжо стары, але, калі пакліча партыя і совецкі ўрад, першым выступлю на абарону сваёй краіны. Рука не задрыжыць, не падвядзе вока. Метка буду біць ворага.

Па ініцыятыве ордэнаносцаў у калгасе шырока разгорнута перадкастрычніцкае спаборніцтва. Спаборнічаюць паміж сабой брыгады. Калгас спаборнічае з калгасам «Совецкая Беларусь». Стаханаўкі Церахава, Кузміч, Люборская і іншыя на апрацоўцы ільну перавыконваюць нормы ў тры разы. Калгаснікі абавязаліся ў бліжэйшыя дні закончыць копку бульбы, апрацоўку і здачу ільнапрадукцыі.

Да свята ў калгасе ўстанаўліваецца радыёпрыёмнік, радыёфікуюцца кватэры калгаснікаў. Калгасная бібліятэка папаўняецца літаратурай. Калгасныя гурткі ўзмоцнена рыхтуюцца да святочнага вечара.

У Новасібірску арганізавана сетка гурткоў хатніх гаспадынь і пенсіянераў па вывучэнню Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР. НА ЗДЫМКУ: член ВКП(б) пісьменнік В. А. Іцін праводзіць гутарку аб новым выбарчым законе з хатнімі гаспадынямі ў доме № 54 па Краснаярскай вуліцы.

Фото Г. Белянціна (СФ).

СОТНІ НОВЫХ АГІТАТАРАЎ ВЫБАРЧАГА ЗАКОНА

З часу апублікавання Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР па ўсіх прадпрыемствах, арцелях, установах і сярод неарганізаванага насельніцтва г. Магілева было праведзена 137 агульных сходаў, якімі ахоплена 15.780 чалавек. Апрача гэтага, на прадпрыемствах было арганізавана для рабочых 213 гурткоў, у якіх займаецца каля 4 тысяч чалавек. У 16-ці школах арганізавана 60 гурткоў для бацькоў і хатніх работніц, у якіх займаецца 1.620 чал. У жактах пачынаюць працаваць 112 гурткоў, для якіх ужо вылучаны і зацверджаны кіраўнікі.

З мэтай забяспечыць гурткі неабходнай літаратурай, горсовет закупіў 25 тысяч брашур «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР». У канцы верасня былі праведзены ў летнім гарадскім садзе 2 палітмасоўкі для неарганізаванага насельніцтва, на якіх былі зроблены даклады аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР.

Трэба сказаць, однак, што арганізаваныя гурткі вельмі малакольксасны, не ахапляюць усіх выбаршчыкаў. Апрача таго, да гэтага часу яны былі кароткатэрміновымі, у большасці сваёй праводзілі па 1—2 заняткі.

З мэтай палепшыць прапаганду выбарчага закона, у канцы верасня была склікана нарада старшынь секцый горсовета і старшынь дэпутацкіх груп. Мы рашылі, разам з гаркомам партыі, праводзіць заняткі па праграме, апублікаванай у «Бюлетэні агітатара», разлічанай на 5 заняткаў.

Галоўная бяда заключаецца ў тым, што некаторыя работнікі праяўляюць незаворотлівасць, вялясць у гэтым пытанні; у іх адсутнічае неабходная ініцыятыва і энергія. Напрыклад, яшчэ на сёння не праведзен сход маладых выбаршчыкаў па гораду. Не праведзен і палітдзень на аўтарамонтным заводзе. У многіх яшчэ мясцах прапаганда выбарчага закона не арганізавана.

Зараз горад разведзен на 37 выбарчых участкаў, падабраны адпаведныя памяшканні, прымацаваны 46 чалавек членаў горсовета, якія будуць весці адпаведную работу—правяраць колькасць насельніцтва і т. д.

Зараз перад намі стаіць баявая задача — ахапіць пагалоўна ўсё насельніцтва перадвыбарчай большэвіцкай агітацыяй і прапагандай. Для гэтага мы мабілізуем новыя сотні агітатараў з большэвікоў, партыйных і непартыйных.

В. І. АНІСІМАЎ,
старшыня магілеўскага горсовета.

ВЫВУЧАЮЦЬ ВЫБАРЧЫ ЗАКОН

У Менскім педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага ідзе актыўная падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. На палітзаняткі комсамольскай і прафсаюзнай сеткі, дзе ахоплены вучобай усе студэнты, ужо закончылі распрацоўваць Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет. У парткабінеце вывешана схема, дзе студэнты наглядна знаёмяцца, як будуць праходзіць выбары. Таксама арганізавана выстаўка літаратуры па вывучэнню Палажэння аб выбарах.

Партыйны і комсамольскі камітэт вылучаюць студэнтаў агітатарамі, частка з іх ужо прыступіла да работы на прадпрыемствах.

***

У Беларускім юрыдычным інстытуце штодзённа працуюць два кансультанты з прафесарска-выкладчыцкага складу. Яны праводзяць інструктаж студэнтаў па распрацоўцы «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет». На палітзаняткі ужо азнаёмілі ўсіх студэнтаў з прадстаўнікамі выбарамі. У інстытуце таксама арганізавана выстаўка літаратуры для вывучэння Палажэння аб выбарах.

Н. Р.

У дапамогу нізавому агітатару

Р. ВОЛЬСКІ

ВЫЗНАЧЭННЕ ВЫНІКАЎ ВЫБАРАЎ

У дзень выбараў, роўна ў 12 гадзін ночы, закрываецца доступ у зыбарчыя памяшканні і пасля таго, як паданы былі галасы выбаршчыкаў, якія асталіся пры закрыцці памяшкання для выбараў, Участковая выбарчая камісія прыступае да падліку галасоў. Пры падліку галасоў маюць права прысутнічаць спецыяльна на тое ўпаўнаважаныя прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, а таксама прадстаўнікі друку.

Ускрыўшы выбарчую скрынку, Участковая выбарчая камісія перш за ўсё робіць падлік канвертаў, не распячатваючы іх, і звярае лік паданых канвертаў з лікам асоб, прымаўшых удзел у галасаванні. Рэзультаты зверкі заносяцца ў пратакол. Потым старшыня Ўчастковай выбарчай камісіі ўскрывае асобна кожны канверт, правярае знаходзячыяся ў ім выбарчыя бюлетэні і агалашае ў прысутнасці членаў выбарчай камісіі вынікі галасавання па кожнаму бюлетэню. Выбарчыя бюлетэні, не адпавядаючыя патрабаванням закона, а іменна—паданыя без канверта ці паданыя ў канвертах неўстаноўленага ўзору, выбарчыя бюлетэні неўстаноўленага ўзору і колеру ці бюлетэні з прозвішчам больш чым аднаго кандыдата,— прызнаюцца несапраўднымі.

Падлік галасоў вядзецца асобна на кожнага кандыдата ў Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей. Пры падліку галасоў сакратаром і ўпаўнаважанымі на тое членамі Ўчасткозай выбарчай камісіі вядзецца падліковы ліст у двух экземплярах на кожнага кандыдата ў дэпутаты. Пасля сканчэння падліку галасоў складаецца пратакол галасавання па форме і ўзорах, устаноўленых Цэнтральнай выбарчай камісіяй, згодна патрабаванням арт. 93 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР»:

«У пратаколе галасавання Ўчастковай выбарчай камісіі павінна быць указана:

а) час пачатку і сканчэння падачы галасоў;

б) лік выбаршчыкаў, падаўшых галасы па спіску выбаршчыкаў;

в) лік выбаршчыкаў, падаўшых галасы па «пасведчаннях на права галасавання»;

г) лік паданых канвертаў;

д) кароткі выклад заяў і скарг, паданых ва Ўчастковую выбарчую камісію, і прынятыя Ўчастковай выбарчай камісіяй рашэнні;

е) вынікі падліку галасоў па кожнаму кандыдату».

Пасля падпісання пратакола старшынёй, сакратаром і прысутнымі членамі Ўчастковай выбарчай камісіі, старшыня агалашае рэзультаты галасавання па данаму выбарчаму ўчастку.

Канчатковыя вынікі выбараў па выбарчай акрузе ўстанаўляе адпаведная Акруговая па выбарах у Совет Саюза выбарчая камісія ці Акруговая па выбарах у Совет Нацыянальнасцей выбарчая камісія, на аснове пратаколаў, прадстаўленых участковымі выбарчымі камісіямі. Прыступаючы да падліку галасоў па выбарчай акрузе, Акруговая выбарчая камісія перш за ўсё пераконваецца, што з усіх выбарчых участкаў паступілі пратаколы галасавання па падліковых лістах. На пасяджэнні Акруговай выбарчай камісіі пры падліку галасоў маюць права прысутнічаць упаўнаважаныя прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, а таксама прадстаўнікі друку. У пратаколе Акруговай выбарчай камісіі павінна быць указана:

«а) агульны лік выбаршчыкаў па акрузе;

б) агульная колькасць выбаршчыкаў, прыняўшых удзел у галасаванні;

в) лік галасоў, паданых за кожнага кандыдата ў дэпутаты:

г) кароткі выклад заяў і скарг, паданых у Акруговую выбарчую камісію, і прынятыя Акруговай выбарчай камісіяй рашэнні».

Пры падліку галасоў вядзецца ў двух экземплярах падлікозы ліст, у якім адзначаецца колькасць галасоў, атрыманая кожным кандыдатам у дэпутаты па кожнаму выбарчаму ўчастку асобна.

Пасля сканчэння падліку галасоў і падпісання пратакола, старшыня Акруговай па выбарах у Совет Саюза выбарчай камісіі агалашае вынікі выбараў і выдае выбранаму кандыдату ў дэпутаты Совета Саюза пасведчанне аб выбранні. Адпаведна дзейнічае і старшыня Акруговай па выбарах у Совет Нацыянальнасцей выбарчай камісіі.

Выбраным з'яўляецца кандыдат у дэпутаты, які атрымаў больш паловы ўсіх галасоў, паданых па адпаведнай выбарчай акрузе калі ў выбарах прыняла ўдзел не менш паловы выбаршчыкаў данай акругі. Калі ні адзін з кандыдатаў не атрымаў больш паловы галасоў, адпаведная Акруговая выбарчая камісія назначае перабалатыроўку двух кандыдатаў, атрымаўшых найбольшую колькасць галасоў, не пазней чым праз 2 тыдні пасля першых выбараў. Калі агульная колькасць паданых па выбарчай акрузе галасоў менш паловы выбаршчыкаў данай акругі, выбары прызнаюцца несапраўднымі. Акруговая выбарчая камісія паведамляе аб гэтым неадкладна ў Цэнтральную выбарчую камісію і ў Выбарчую камісію саюзнай рэспублікі, аўтаномнай рэспублікі ці аўтаномнай вобласці па выбарах у Совет Нацыянальнасцей. Новыя выбары па данай выбарчай акрузе назначаюцца Цэнтральнай выбарчай камісіяй не пазней чым у двухтыднёвы тэрмін пасля першых выбараў.

Перабалатыроўка, а таксама новыя выбары, праводзіцца па спісках выбаршчыкаў, складзеных для першага туру выбараў, у поўнай адпаведнасці з «Палажэннем аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР». Выбарчы закон сацыялістычнай дзяржавы ўстанавіў такі парадак падліку галасоў і вызначэння вынікаў выбараў, пры якім дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР будуць сапраўды выразнікамі волі большасці совецкага народа. «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» устанаўлівае суровыя меры пакарання для кожнага, хто шляхам гвалту, ашукаўства, пагроз ці подкупу, падробкі дакументаў ці заведамы няправільнага падліку галасоў будзе перашкаджаць грамадзянініу СССР у ажыццяўленні яго выбарчага права, будзе скажаць волю выбаршчыкаў.

Выбарчы закон устанаўлівае, што выбраным лічыцца той кандыдат, які атрымаў абсалютную большасць, прычым у галасаванні павінна прымаць удзел не менш паловы выбаршчыкаў, маючых права галасавання па данай выбарчай акрузе.

У такіх буйнейшых буржуазна-дэмакратычных краінах, як ЗША, Англія, Францыя (у апошній пры паўторнай балатыроўцы), патрабуецца, каб кандыдат у дэпутаты парламента атрымаў толькі найбольшую колькасць галасоў, гэта значыць адносную большасць. Вялікая колькасць выбарчых кампаній ў гэтых краінах пацвердзіла, што партыі, перамогшыя на выбарах, прадстаўляюць меншую частку выбаршчыкаў данай краіны, у выніку чаго большасць выбаршчыкаў пазбаўляецца ўсякага прадстаўніцтва ў парламенце. Для прыкладу прызнаем некалькі лічб апошніх гох.

У Англіі:

у 1922 г. кансерватары атрымалі 6.990 тыс. галасоў і 344 месцы ў парламенце

лібералы атрымала 9.349 тыс. галасоў і 271 месца ў парламенце;

у 1924 г. кансерватары атрымалі 8.545 тыс. галасоў і 412 месц у парламенце;

лібералы атрымала 9.172 тыс. галасоў і 203 месца ў парламенце.

У 1935 г. з агульнай колькасці выбаршчыкаў ў 30 мільёнаў кансерватары атрымалі 10.488 тыс. галасоў і 387 мандатаў, лейбарысты—8.325 тыс. галасоў і 154 мандаты.

Падобнае становішча мае месца і ва Францыі, дзе выбраным у першым туры з'яўляецца кандыдат, які атрымаў больш паловы ўсіх паданых у данай выбарчай акрузе галасоў, прычым агульны лік паданых у гэтай акрузе галасоў не павінен быць менш адной чвэрці ліку ўсіх выбаршчыкаў данай акругі. Калі ні адзін з кандыдатаў не атрымаў патрабуемай большасці, праводзіцца балатыроўка ў другі раз (гэтых-жа кандыдатаў), пры якой выбраным з'яўляецца кандыдат, які атрымаў самы большы лік галасоў, гэта значыць адносную большасць. У сувязі з выстаўленнем велізарнай колькасці кандыдатаў у дэпутаты парламента (ў 1928 годзе—3.763, у 1932 г.—3.837), расце і колькасць неабходных перабалатыровак, якія дасягнулі лічбы 422 ў 1928 г. і 359 у 1932 г., супроць 252 у 1914 і 227 у 1910 г. Такім чынам, ва Францыі каля паловы месц у парламенце размяркоўваецца на аснове прынцыпу адноснай большасці, у выніку чаго парламент прадстаўляе толькі меншасць выбаршчыкаў.

У ЗША ў 1926 г. у выбарах членаў кангрэса прынялі ўдзел усяго 25 проц. выбаршчыкаў; у 1934 годзе — ўсяго 43 проц. выбаршчыкаў. На выбарах прэзідэнта ЗША мала места такое-ж становішча. Куліж быў выбран у 1924 г. прэзідэнтам 29-ю процантамі выбаршчыкаў, карыстаючыхся правам голасу. Гувер у 1928 г. быў выбран 35-ю процантамі, а Рузвельт у 1932 і 1936 гг.—34 проц. агульнай колькасці выбаршчыкаў.

Прыведзеныя лічбы паказваюць, што вынікі выбараў у буйнейшых буржуазна-дэмакратычных краінах скажаюць волю большасці выбаршчыкаў (не гаворачы ўжо пра абмежаванні самога ліку выбаршчыкаў).

Пануючая ў капіталістычных краінах меншасць эксплаататараў, апіраючыся на сваю эканамічную ўладу над прапоўнымі, карыстаючыся гіганцкім апаратам гвалту, хлусні і ашуканства, скажае волю народа.

Толькі ў соцыялістычнай дзяржаве, ліквідаваўшай эксплаататарскія класы, магчыма шляхам галасавання выяўленне сапраўднай волі народа. Дэпутатамі Вярхоўнага Совета СССР будуць сапраўдныя прадстаўнікі совецкага народа, выбраныя на аснове самага дэмакратычнага ў свеце выбарчага права.

ДА 20-годдзя ВЯЛІКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

5 КАСТРЫЧНІКА (22 ВЕРАСНЯ) 1917 г.

Аб'яднанае пасяджэнне Выбаргскага совета палкавых і ротных камандзіраў пастанавіла патрабаваць ад ВЦВК неадкладнага склікання з'езда Саветаў для рашэння пытання аб уладзе.

Цэнтральны стачачны камітэт чыгуначнікаў абвясціў усерасійскую чыгуначную забастоўку.

Закрылася Дэмакратычная Нарада.

«Далейшае разлажэнне ўрадавых партый эс-эраў і меншавікоў, яўная для ўсіх страта імі большасці ў рэволюцыйнай дэмакратыі, крок наперад у аб'яднанні і агаленні банапартызма як пана Керэнскага, так і шп. Цэрэтэлі, Чэрнова і К° — такое класавае значэнне нарады».

(Ленін, т. XXI, стар. 211).

НА МІЖНАРОДНЫЯ ТЭМЫ

ПАСЛЯ ВІЗІТУ МУСАЛІНІ Ў БЕРЛІН

Мэта паездкі фашысцкага дыктатара Італіі Мусаліні ў Германію, паездкі, якая адбылася ў момант напружанага міжнароднага становішча, не можа не цікавіць шырокую грамадскую думку. Тым больш, што па фактах мінулага многія краіны ўжо пасцелі пераканацца, што за кожным такім узаемным візітам фашысцкіх дзеячоў Рыма і Берліна адбываліся новыя ваенныя правакацыі.

Няма сумнення, што гэты візіт Мусаліні мае немалаважнае значэнне для палітыкі фашысцкай Германіі і Італіі. За ўрачыстымі сустрэчамі, парадамі і ўсёй шуміхай, паднятай фашысцкім друкам з повазу гэтага візіту, дастаткова відны яго мэты. Гітлер і Мусаліні хочуць ператварыць палітыку «асі Рым—Берлін» у пастаянны ваенна-палітычны саюз двух галоўных падпальшчыкаў вайны на Еўрапейскім кантынэнце, яшчэ больш расшырыць узброеную інтэрвенцыю ў Іспаніі і падрыхтаваць новыя правакацыі супроць іншых дзяржаў Еўропы.

Бліжэйшыя планы фашысцкіх саюзнікаў у Іспаніі вядомы з прамовы іспанскага прэм'ера Негрына на сесіі Лігі нацый, які, на аснове атрымытых крыніц, заявіў аб пасылцы ў Іспанію вялікай колькасці новых італа-германскіх войск. Прамова Мусаліні з повазу заняцця Сантандэра рэгулярнымі дывізіямі італьянскай армії з'яўляецца даволі ясным указаннем на далейшыя інтэрвенцыяністкія планы Італіі і яе саюзніцы Германіі.

Як відаць, Гітлер і Мусаліні, алчуўшы пад Мадрыдам, Гвадалахарай і ў Арагоніі растучую магутнасць іспанскай рэспубліканскай армії, пачынаюць апасацца, якбы гэта інтэрвенцыя не кончылася іх поўным паражэннем. Адсюль планы дадатковай пасылкі вялікай колькасці войск і абмеркаванне гэтых планаў пры паездцы Мусаліні ў Германію.

Ніёнскім пагалненнем, не гледзячы на ўсе яго недахопы, нанесен істотны ўдар па прэстыжу Італіі. У рэзультаце Ніёнскай канферэнцыі Італія ўбачыла, што ўступка яе агрэсіі з боку Англіі і Францыі мае свае межы. Англія і Францыя, як вядома, вымушаны былі прыняць меры па ахове безапаснасці на Міжземным моры. Меры гэтыя так ці інакш накіраваны супроць Італіі, хаця Англія і Францыя аб гэтым адкрыта не заявілі. Совецкая дэлегацыя і яе першы дэлегат на Ніёнскай канферэнцыі тав. Літвінаў перад усім светам сарвала маску з італьянскіх дыпратаў. Апынуўшыся ў даволі нявыгадным становішчы, фашысцкі дыктатар Італіі хутчэй паспяшыў да Гітлера, каб, побач з пытаннем расшырэння інтэрвенцыі ў Іспаніі, абмеркаваць план новых правакацый.

Не выключана магчымасць новых пірацкіх выступленняў на Міжземным моры з боку фашысцкай Італіі. Аднак пасля аплявухі, атрыманай на Ніёнскай канферэнцыі, Мусаліні і Гітлер свае праваканыйныя замыслы пераносяць, галоўным чынам, на сухазем'е.

Аб тым, што гэта так, можна судзіць па водгуках фашысцкага друку, які прама ўказвае, што галоўным матывам усіх размоў «дучэ» і «фюрэра» з'яўляюцца вядомыя гутаркі аб «чырвонай небяспецы», аб «большэвізме». Напярэдадні сваёй паездкі, Мусаліні ў Палермо гаварыў: «Я заяўляю і ў зусім катэгарычнай форме, што мы ніколі не папершім большэвізма і што-небудзь падобнае яму ў раёне Міжземнага мора».

Фашысцкая газета «Іль-Паполо д'Італія» адразу-ж растлумачыла, што «большэвізмам ці што-небудзь падобным на яго» з'яўляецца народны фронт у радзе краін Еўропы. Другая італьянская газета—«Рэжыме-фашыста» прама пісала, што «мір з Францыяй немагчым, пакуль будзе існаваць там народны фронт».

З гэтага не цяжка здагадацца, што адной з галоўных мэт ваенна-палітычнага саюза Італіі і Германіі з'яўляецца падрыхтоўка новых правакацый супроць іншых дзяржаў Еўропы і ў першую чаргу супроць Чэхаславакіі і Францыі. Італа-германскі ваенны саюз, для ўмацавання якога і паехаў Мусаліні да Гітлера, накіраван супроць незалежнасці малых дзяржаў, накіраван на падрыхтоўку фашысцкіх мяцежаў у дэмакратычных краінах, падобна таму, як у ліпені 1936 года быў арганізован з дапамогай Франко фашысцкі мяцеж у Іспаніі.

Французскія і чэхаславацкія «Франко»—агенты Гітлера і Мусаліні ў буржуазна-дэмакратычных краінах — ужо плятуць сетку змоў і арганізуюць рад правакацый.

Жадаючы паскорыць падрыхтоўку «вялікай вайны», германскі фашызм прыступае да рэалізацыі сваіх планаў у Паўднёва-Усходняй Еўропе і асабліва ў Аўстрыі. Не падлягае сумненню, што гэта было аблта. Зенітная артылерыя прымусіла паветранага «ворага» кінуцца наўцёкі.

На працягу некалькіх гадзін было параўнаўча спакойна. Але, як даносіла разведка, «праціўнік» накапліваў новыя сілы для вялікага наступлення. Па ўсіх даных на гэты раз ён рашыў раптоўным нападам паралізаваць некалькі раёнаў горада адразу. Усе асоавіяхімаўскія падраздзяленні былі прыведзены ў гатоўнасць.

11 гадзін раніцы. Горад жыве сваім штодзённым працоўным жыццём. Самі грамадзяне ў гэтыя дні вучэнняў па пропіпаветранай абароне сталі больш падцягнутымі і дысцыплінаванымі. Многа хатніх гаспадынь, выходзячы на рынак ці ў магазін за пакупкамі, ішлі з перакінутымі праз плячо супрацівагазамі. У паштальёна побач з сумкай для карэспанднэнцый вісіць працівагаз. Усе ўважліва прыслухоўваюцца — ці не чуваць трывожных гудкоў.

11 гадзін 23 мінуты. Падымаючыся высока ў неба, над горадам плывуць трывожныя гулкі. Яны чутны на ўсіх ускраінах і далёка навокал. Пры гэтых сігналах міліцыі не прыходзіцца ўжо ўпрашваць грамадзян хавацца ў пад'езды дамоў, у магазіны. Як толькі пачуўся голас дыктатара, які абвяшчаў аб пачатку трывогі, вуліцы і плошчы ў момант апустэлі. Толькі відаць былі пасрэднікі ў белых павязках, міліцэйскія пасты і там-сям фотакарэспандэнты са сваімі апаратамі.

За час вучэнняў учора быў самы вялікі «бой». Авіяцыя «праціўніка» рухалася з паўднёвага ўсхода да цэнтра горада. І на гэты раз яна папярэдзела няўдачу. Зенітная артылерыя зноў прымусіла яе ўцячы. Праз некалькі мінут пасты ПВА паведамілі аб руху «бамбавозаў» «праціўніка» з захада. Адначасова над цэнтрам горада з'явілася другая вялікая група самалётаў.

Яны скідаюць запальваючыя і хімічныя «бомбы». То ў адным, то ў другім месцы ўспыхваюць «пажары». «Гарыць» дом на рагу Совецкай і Энгельса, разбуран трамвайны пуць паміж вуліцамі Комуністычнай і Энгельса. «Полымем» ахоплен Дом профсаюзаў. Стварыўся вялікі ачаг «паражэння», ахапіўшы ўвесь цэнтр горада.

Становішча было настолькі сур'ёзным, што на ліквідацыю ачагоў паражэння прышлося кінуць сілы трох раёнаў. Байцы і каманзіры пажарных каманд адважна змагаліся з агнём. Апранутыя ў працівагазы і пропіпрытныя касцюмы, байцы медыка-санітарнай службы падбіралі «раненых» і «атручаных», апраўдялі іх на абмывачныя і санітарныя пункты. Узорна працавалі на дэгазацыі ачагоў паражэння хімічныя падраздзяленні жакта № 17 і Сталінскага раёна.

Цікава было назіраць работу брыгады рабочых службы пуці менскага трамвая. Пуць паміж вуліцамі Комуністычнай і Энгельса быў пашкоджан самым сапраўдным чынам. Узарваўшайся «бомбай», былі выварачаны рэйкі, стварылася глыбокая яма і вырваны шпалы. На месца прыбыла грузавая машына з новымі рэйкамі і шпаламі. Ударна працавала брыгада рабочых у працівагазах і пропіпрытных касцюмах. Пуць быў адноўлен на працягу 18 мінут.

Авіяцыя «праціўніка» адначасова паставіла сабе мэтай вывесці са строю важныя прамысловыя аб'екты. На завод імя Варашылава і на кандзіцерскую фабрыку «Комунарка» скінуты запальваючыя хімічныя бомбы. Тут успыхнулі «пажары». «Пажары» і ачагі паражэння ліквідаваліся сваімі сіламі. «Праціўніку» не ўдалося парушыць нармальную работу на гэтых прадпрыемствах. Рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі прадаўжалі рабочы дзень у працівагазах.

У 12 гадзін 30 мінут быў дан сігнал адбою. Заражаныя месцы апеплівалися. Пачалася работы па ліквідацыі ачагоў паражэння. Пачалося нармальнае жыццё ў горадзе.

***

На гэтым закончыліся вучэнні па пропіпаветранай абароне Менска. Вучэнні паказалі выключную згуртаванасць падраздзяленняў, уменне хутка і аператыўна дзейнічаць і ліквідаваць ачагі паражэнняў. Дзякуючы ўзорнай рабоце падраздзяленняў сувязі, штабы своечасова атрымлівалі весткі аб набліжаючыхся самалётах «праціўніка». Варта адзначыць добрую дысцыпліну байцоў усіх асоавіяхімаўскіх падраздзяленняў і хуткае прыняцце рашэнняў камандным саставам.

«Вораг» паспяхова адбіт і знішчан. Таксама ён будзе знішчан, калі на самой справе ён адважыцца напасці на нашу сацыялістычную радзіму. Прапоўныя сталіны БССР у прайшоўшых вучэннях ПВА яшчэ раз прадэманстравалі любоў і адданасць да сваёй сацыялістычнай радзімы, гатоўнасць па першаму закліку партыі і ўрада стаць на абарону граніц СССР, гатоўнасць мацаваць абароназдольнасць Совецкай краіны.

Н. ГАРНЫ.
І. МІНДЗЕЛЬ.

ВУЧЭННІ ПА ПРОЦІПАВЕТРАНАЙ АБАРОНЕ Ў МЕНСКУ.
У часе хімічнай трывогі ўсе рабочыя завода імя Варашылава працавалі ў працівагазах. Фото С. Грына.

ЗАКОНЧЫЛІСЯ ВУЧЭННІ ПА ПРОЦІПАВЕТРАНАЙ АБАРОНЕ МЕНСКА

Ноч з 3 на 4 кастрычніка была трывожнай. З гадзіны на гадзіну чакалася, што «праціўнік» паўторыць свае налёты. З наглядальных вышак усю ноч незыходзілі дазорныя. Бесперапынна ішла работа штабаў усіх раёнаў. Байцы і каманзіры асоавіяхімаўскіх падраздзяленняў былі на пагатове.

Калі развіднела, дзесьці далёка на гарызонце паказаліся маленькія чорныя кропкі—гэта былі «непрыяцельскія» разведчыкі. Стала ясным, што «вораг» рыхтуе ўдар. І сапраўды, неўзабаве быў заўважан рух самалётаў «праціўніка» ў напрамку да цэнтра Менска. У 9 гадзін 30 мінут трывожна загулі сірэны.

Аднак, нападзенне на горад было хутка адбіта. Зенітная артылерыя прымусіла паветранага «ворага» кінуцца наўцёкі.

На працягу некалькіх гадзін было параўнаўча спакойна. Але, як даносіла разведка, «праціўнік» накапліваў новыя сілы для вялікага наступлення. Па ўсіх даных на гэты раз ён рашыў раптоўным нападам паралізаваць некалькі раёнаў горада адразу. Усе асоавіяхімаўскія падраздзяленні былі прыведзены ў гатоўнасць.

11 гадзін раніцы. Горад жыве сваім штодзённым працоўным жыццём. Самі грамадзяне ў гэтыя дні вучэнняў па пропіпаветранай абароне сталі больш падцягнутымі і дысцыплінаванымі. Многа хатніх гаспадынь, выходзячы на рынак ці ў магазін за пакупкамі, ішлі з перакінутымі праз плячо працівагазамі. У паштальёна побач з сумкай для карэспанднэнцый вісіць працівагаз. Усе ўважліва прыслухоўваюцца — ці не чуваць трывожных гудкоў.

11 гадзін 23 мінуты. Падымаючыся высока ў неба, над горадам плывуць трывожныя гулкі. Яны чутны на ўсіх ускраінах і далёка навокал. Пры гэтых сігналах міліцыі не прыходзіцца ўжо ўпрашваць грамадзян хавацца ў пад'езды дамоў, у магазіны. Як толькі пачуўся голас дыктатара, які абвяшчаў аб пачатку трывогі, вуліцы і плошчы ў момант апустэлі. Толькі відаць былі пасрэднікі ў белых павязках, міліцэйскія пасты і там-сям фотакарэспандэнты са сваімі апаратамі.

За час вучэнняў учора быў самы вялікі «бой». Авіяцыя «праціўніка» рухалася з паўднёвага ўсхода да цэнтра горада. І на гэты раз яна папярэдзела няўдачу. Зенітная артылерыя зноў прымусіла яе ўцячы. Праз некалькі мінут пасты ПВА паведамілі аб руху «бамбавозаў» «праціўніка» з захада. Адначасова над цэнтрам горада з'явілася другая вялікая група самалётаў.

Яны скідаюць запальваючыя і хімічныя «бомбы». То ў адным, то ў другім месцы ўспыхваюць «пажары». «Гарыць» дом на рагу Совецкай і Энгельса, разбуран трамвайны пуць паміж вуліцамі Комуністычнай і Энгельса. «Полымем» ахоплен Дом профсаюзаў. Стварыўся вялікі ачаг «паражэння», ахапіўшы ўвесь цэнтр горада.

Становішча было настолькі сур'ёзным, што на ліквідацыю ачагоў паражэння прышлося кінуць сілы трох раёнаў. Байцы і каманзіры пажарных каманд адважна змагаліся з агнём. Апранутыя ў працівагазы і пропіпрытныя касцюмы, байцы медыка-санітарнай службы падбіралі «раненых» і «атручаных», апраўдялі іх на абмывачныя і санітарныя пункты. Узорна працавалі на дэгазацыі ачагоў паражэння хімічныя падраздзяленні жакта № 17 і Сталінскага раёна.

Цікава было назіраць работу брыгады рабочых службы пуці менскага трамвая. Пуць паміж вуліцамі Комуністычнай і Энгельса быў пашкоджан самым сапраўдным чынам. Узарваўшайся «бомбай», былі выварачаны рэйкі, стварылася глыбокая яма і вырваны шпалы. На месца прыбыла грузавая машына з новымі рэйкамі і шпаламі. Ударна працавала брыгада рабочых у працівагазах і пропіпрытных касцюмах. Пуць быў адноўлен на працягу 18 мінут.

Авіяцыя «праціўніка» адначасова паставіла сабе мэтай вывесці са строю важныя прамысловыя аб'екты. На завод імя Варашылава і на кандзіцерскую фабрыку «Комунарка» скінуты запальваючыя хімічныя бомбы. Тут успыхнулі «пажары». «Пажары» і ачагі паражэння ліквідаваліся сваімі сіламі. «Праціўніку» не ўдалося парушыць нармальную работу на гэтых прадпрыемствах. Рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі прадаўжалі рабочы дзень у працівагазах.

У 12 гадзін 30 мінут быў дан сігнал адбою. Заражаныя месцы апеплівалися. Пачалася работы па ліквідацыі ачагоў паражэння. Пачалося нармальнае жыццё ў горадзе.

***

На гэтым закончыліся вучэнні па пропіпаветранай абароне Менска. Вучэнні паказалі выключную згуртаванасць падраздзяленняў, уменне хутка і аператыўна дзейнічаць і ліквідаваць ачагі паражэнняў. Дзякуючы ўзорнай рабоце падраздзяленняў сувязі, штабы своечасова атрымлівалі весткі аб набліжаючыхся самалётах «праціўніка». Варта адзначыць добрую дысцыпліну байцоў усіх асоавіяхімаўскіх падраздзяленняў і хуткае прыняцце рашэнняў камандным саставам.

«Вораг» паспяхова адбіт і знішчан. Таксама ён будзе знішчан, калі на самой справе ён адважыцца напасці на нашу сацыялістычную радзіму. Прапоўныя сталіны БССР у прайшоўшых вучэннях ПВА яшчэ раз прадэманстравалі любоў і адданасць да сваёй сацыялістычнай радзімы, гатоўнасць па першаму закліку партыі і ўрада стаць на абарону граніц СССР, гатоўнасць мацаваць абароназдольнасць Совецкай краіны.

Н. ГАРНЫ.
І. МІНДЗЕЛЬ.

ПЕРАДАЧА ПА РАДЫЁ ЗАПІСУ НА ТОНФІЛЬМ ДАКЛАДА тав. СТАЛІНА І ПРАМОВЫ тав. МОЛАТАВА АБ ПРАЕКЦЕ КАНСТЫТУЦЫІ СССР

5 кастрычніка ў 18 гадзін 30 мінут праз менскую радыёстанцыю імя СНК БССР будзе перадавацца запісаны на тонфільм (светавы плёначны запіс) гістарычны даклад таварыша **Сталіна** на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Саветаў аб праекце Сталінскай Канстытуцыі.

Запіс прамовы таварыша **Молатава** будзе перадавацца 6 кастрычніка ў 20 гадзін.

Даклад таварыша **Сталіна** і прамова таварыша **Молатава** будуць трансліравацца ўсімі радыёвузламі БССР.

У гарадах і сёлах рэспублікі арганізуецца масавае радыёслуханне.

—○—

IV УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД АСОАВІЯХІМА

10 кастрычніка ў Менску склікаецца IV Усебеларускі з'езд Асоавіяхіма. На павестцы дня — справаздачы ЦК Асоавіяхіма, рэвізійнай камісіі і выбары ў кіруючыя органы. У рабоце з'езда прымуць удзел 350 дэлегатаў.

У сучасны момант у сувязі з набліжэннем з'езда заканчваюцца перавыбары нізавых арганізацый Асоавіяхіма. У радзе раёнаў праведзены раённыя канферэнцыі.

—○—

СУД

СПРАВА РАБОТНІКАЎ МЛЫНА „АДРАДЖЭННЕ"

3-га кастрычніка на ранішнім пасяджэнні спецыяльная калегія Вярхоўнага суда БССР заслухала паказанні сведак, якія пацвердзілі суду факты шкодніцтва на мелькрупзаводзе № 4 «Адраджэнне».

Сведка, загадчык лабараторыі Дзяржхлебінспекцыі Савіцкая расказала суду аб тым, што калі яна пасля праверкі склала акт аб нягоднасці магнітнага станка, кіраўнікі завода не прынялі ніякіх мер для знішчэння дэфектаў у станку, а акт паклалі пад сукно.

Другі сведка — начальнік ППХА завода Падубінкі паказаў, што газаныя пэхаў хлор-пікрынам праводзілася без захавання элементарных правіл бяспасці. Толькі дзякуючы яго ўмяшанню было папярэджана атручанне рабочага Чабанава, па віне тэхнічнага кіраўніка завода Меленцева.

Пад бокам Саюзмукі ў Менску доўгі час беспакарана арудавала група шкоднікаў, наносячы дзяржаве вялікія страты. Хто-ж гэтыя людзі? Былы дырэктар завода Гаралік — у мінулым член контрэволюцыйнай сіяніскай партыі «Гехолуп», у якой ён быў з 1917 па 1922 год. Тэхнічны кіраўнік Меленцеў ужо раз судзіўся за дапушчэнне выпуску нязгодных круп. Другі тэхнічны кіраўнік завода — абвінавачваемы Матусевіч — сын ганцляра.

На вячэрнім пасяджэнні выступілі прадстаўнік дзяржаўнага абвінавачання пракурор тав. Гурвіч і абаронцы тт. Левін і Уніхоўскі.

***

Учора ў 2 гадзіны ночы спецыяльная калегія Вярхоўнага суда БССР вынесла прыгавор па справе работнікаў мелькрупзавода № 4 «Адраджэнне».

Былы дырэктар завода Гаралік С. Г., тэхнічныя кіраўнікі гэтага завода Матусевіч М. М. і Меленцеў П. В., якія абвінавачваліся ў шкодніцтве, прыгавораны да 10 год пазбаўлення волі ў аддаленых мясцовасцях СССР кожны. Усе яны пазбаўлены правоў тэрмінам на 5 год пасля адбыцця пакарання.

Г. М.

ВЫСТАЎКА „БССР ЗА 20 ГОД"

Учора адбылося пасяджэнне ўрадавага камітэта па арганізацыі да XX гадавіны Кастрычніка рэспубліканскай выстаўкі «БССР за 20 год». Зацвярджаліся планы прамысловага адзела выстаўкі, аддзелаў навукі і народнай асветы.

Багатым і рознастайным будзе прамысловы аддзел. За гады сталінскіх пяцігодак у БССР выраслі буйныя прадпрыемствы, як Гомсельмаш, шклозавод імя Сталіна, фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» і інш. На выстаўцы будуць паказаны экспанаты прадукцыі гэтых новых прадпрыемстваў — навейшыя машыны і станкі, якія за апошнія гады асвоены на прадпрыемствах рэспублікі.

Шырока будзе паказана механізацыя лясной, тарфяной, швейнай і шчацінная прамысловасці і т. д. Вялікае месца адводзіцца паказу выпуску прадметаў шырокага ўжытку.

Цікавым будзе аддзел культуры, які адлюструе рост навукі і культуры Совецкай Беларусі, кадраў навуковых работнікаў Акадэміі навук, навукова-даследчых інстытутаў. Аддзел народнай асветы пакажа клопаты партыі і ўрада аб выхаванні маладога пакалення, рост школ, работу бібліятэк і дамоў сацкультуры. Вялікае месца адводзіцца дзіцячай творчасці.

—○—

ЖАНОЧЫЯ КУЛЯМЁТНЫЯ ГУРТКІ

У азнаменаванне 20-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі на швейнай фабрыцы імя Дзержынскага (Бабруйск) арганізаван першы ў раёне жаночы куляметны гурток.

Такія-ж абаронныя гурткі створаны і на радзе іншых прадпрыемстваў горада.

ПАХАЛАДАННЕ

Да апошніх дзён верасня ў БССР стаяла рэдкае для гэтай пары цёплае надвор'е.

З 1 кастрычніка тэмпература значна знізілася. Барысаўская метэаралагічная станцыя паказвае 1 градус холаду, Марынагорская — 2 градусы холаду. У астатніх пунктах рэспублікі тэмпература хістаецца ад 0 да 4 градусаў цеплыні.

У параўнанні з вераснем значна пахалалала, але паказаныя тэмпературы не з'яўляюцца ніжэйшымі, чым сярэднія тэмпературы ў кастрычніку.

Адчуваючы набліжэнне зімы, на поўдзень адлятаюць стаі жураўлёў і гусей. Бліжэй да жылля туліцца сініца.

(БЕЛТА).

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

7 кастрычніка, у 7 гадзін вечара, у клубе імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай)

адбудзецца

РАСШЫРАНЫ ПЛЕНУМ

МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

сумесна з совецкім актывам.

ПАРАДАК ДНЯ:

Справаздача аб рабоце прэзідыума Горсовета.

(Дакл. т. Кудзельскі).

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

6 кастрычніка, у 12 г. дня,

у памяшканні ДОМА ПІСЬМЕННІКА (Совецкая 68)

адбудзецца

СУСТРЭЧА КІРАЎНІКОЎ МЕНСКІХ ГУРТКОЎ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ УСІХ ЖАНРАЎ З МАЙСТРАМІ МАСТАЦТВАЎ.

Запрашаюцца работнікі мастацтваў, старшыні ЦП саюзаў і кіраўнікі гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Пасля нарады — паход у тэатр музыкальнай камедыі.

КАСТРЫЧНІЦКАЯ КАМІСІЯ.

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» Сёння і штодзённа

ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ДЗЯЎЧЫНА з КАМЧАТКІ

вытворчасць студыі МОСФІЛЬМ.

БЕЛДЗЯРЖДРАМТЭАТР

5 кастрычніка Абанем. № 21. ВАЎКІ І АВЕЧКІ

Пачатак у 8 г. вечара

ДЗЯРЖ. ТЭАТР МУЗКАМЕДЫІ БССР (Памяшканне Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР) 5/X: ГЕЙША

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка» ЗЕЛІМ-ХАН

Дзіцячы гукавы кінотэатр НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» «УЩЕЛЬЕ АЛАМАСОВ»

Гукавы кінотэатр «Спартак» АГНІ ВЯЛІКАГА ГОРАДА

КНІГАГАНДЛЕВАЯ СЕТКА БЕЛАДДЗЯЛЕННЯ КОГІЗа УКЛЮЧЫЛАСЯ Ў ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА І СТАВІЦЬ ПЕРАД САБОЙ НАСТУПНЫЯ ЗАДАЧЫ:

1. Максімальнае задавальненне попыту на літаратуру к выбарам у Вярхоўны Совет Саюза ССР
2. Шырокае абслугоўванне спажыўцоў літаратурай, партрэтамі, скульптурай і мастацкай рэпрадукцыяй да святкавання XX гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі.
3. Задавальненне попыту вучняў на падручнікі і вучэбныя дапаможнікі.
4. Максімальная скупка патрыманых падручнікаў у насельніцтва.

ВА ЎСІХ МАГАЗІНАХ І КІЁСКАХ ЁСЦЬ У ПРОДАЖЫ:

СТАЛІН. — Даклад аб праекце Канстытуцыі СССР.
Канстытуцыя (Асноўны закон) СССР Цана 30 кап.
ЯКАЎЛЕЎ. — Аб праекце «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Саюза ССР». Цана 25 кап.
«Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет Саюза ССС»—на рускай, беларускай і яўрэйскай мовах. Цана 10 к.
ЛЕНІН. — Пісьмы з далека.
ЛЕНІН. — Аб задачах пролетарыята ў данай рэволюцыі (красавіцкія тэзісы).
ЛЕНІН—СТАЛІН. — Ліпеньская дэманстрацыя.
СТАЛІН. — Прамовы на VI з'ездзе РСДРП(б).
СТАЛІН. — Кастрычніцкая рэволюцыя і тактыка рускіх комуністаў.

ПАСТУПАЮЦЬ У ПРОДАЖ НАВІНКІ — КНІГІ З СЕРЫІ «20 ГОД ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ»

ПРЫМАЮЦЦА ЗАКАЗЫ на камплектаванне поўнага збору твораў В. І. ЛЕНІНА, III выданне (у чырвоным пераплёце). Цана за том 3 руб. 30 кап.

ВА ЎСІХ МАГАЗІНАХ І КІЁСКАХ БЕЛАДДЗЯЛЕННЯ КОГІЗ'а ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА АЛЬБОМЫ ГРАМАФОННЫХ ПЛАСЦІНАК З ЗАПІСАМ ДАКЛАДА ТАВАРЫША СТАЛІНА І ПРАМОВЫ ТАВ. МОЛАТАВА НА НАДЗВЫЧАЙНЫМ VIII З'ЕЗДЗЕ СОВЕТАЎ СССР.

Альбомы грампласцінак паступілі для выдачы падпісчыкам.

Для вучняў завочна адкрыта падпіска на зборнікі «СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА НА ДАМУ» —для V і VIII класаў.

У магазінах КОГІЗ'а шырока прадстаўлена літаратура па пытаннях: марксізма-ленінізма, тэхнікі, сельскай гаспадарцы, медыцыны і інш. раздзелах; ноты, масавыя песні і мастацкая рэпрадукцыя (партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада, плакаты, лозунгі, карціны і скульптура), карты геаграфічныя і глобусы.

МЕСЦАЗНАХОДЖАННЕ І АДРАСЫ МАГАЗІНАЎ КОГІЗ'а

1. Цэнтральны кніжны магазін—г. Менск, Совецкая, 71.
2. Ваенна-кніжны магазін—г. Менск, Совецкая, 41.
3. Магазін ІЗОпрадукцыі—г. Менск, Совецкая, 85.
4. Магазін нотнай прадукцыі—г. Менск, Ленінская, 15
5. Аддзел паштовіі КОГІЗ'а—г. Менск, Совецкая, 73.

КНІЖНЫЯ МАГАЗІНЫ Ў ГАРАДАХ: ГОМЕЛЬ, МАГІЛЕЎ, ВІЦЕБСК, ОРША, БАБРУЙСК, БАРЫСАЎ, РЭЧЫЦА, ПОЛАЦК, СЛУЦК, МОЗЫР, ЛЕПЕЛЬ і м. АШМАВІЧЫ.

«Кніга-поштай» Беладдзялення КОГІЗ'а (г. Менск, Совецкая, 71) выконвае заказы наложным плацяжом без задатку па першаму патрабаванню спажыўца.

БЕЛАДДЗЯЛЕННЕ КОГІЗ'а.

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ на ПАЗЫКУ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ (ВЫПУСК ЧАЦВЕРТАГА ГОДА)

АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ (выпуск чацвертага года), НЕ АТРЫМАНЫЯ ПАДПІСЧЫКАМІ ПА МЕСЦУ РАБОТЫ, ЗДАНЫ БУХГАЛТЭРЫЯМ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І УСТАНОЎ, А ТАКСАМА СЕЛЬСОВЕТАМІ Ў АШЧАДНЫЯ КАСЫ Ў АВЯЗЛІЧАНЫМ ВЫГЛЯДЗЕ Г ЗН., НУМАРЫ ГЭТЫХ АБЛІГАЦЫЙ НЕ ЗАМАЦАВАНЫ ЗА П АДПІСЧЫКАМІ.

А ТАМУ, ДА АТРЫМАННЯ НА РУКІ АБЛІГАЦЫЙ, ПАДПІСЧЫКІ НЕ ЎДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ У ЧАРГОВЫХ ТЫРАЖАХ ВЫЙГРЫШАЎ ПА ПАЗЫЦЫ.

ГРАМАДЗЯНЕ, ПАДПІСАЎШЫЯСЯ НА ПАЗЫКУ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ (выпуск чацвертага года) І НЕ АТРЫМАЎШЫЯ АБЛІГАЦЫЙ ПА МЕСЦУ ПАДПІСКІ, ПАВІННЫ АТРЫМАЦЬ ІХ Ў ЦЭНТРАЛЬНЫХ АБО РАЁННЫХ АШЧАДНЫХ КАСАХ, ПРАДСТАВІЎШЫ ДАВЕДКУ АД ВУХГАЛТЭРЫЯЎ ПРАДПРЫЕМСТВА АБО ЎСТАНОВЫ АБ СУМЕ ЎПЛОЧАНЫХ УЗНОСАЎ ПА ПАДПІСЦЫ НА ПАЗЫКУ КАЛІГРАСНІКІ І СЯЛЯНЕ-АДНААСОБНІКІ. ПРЫ АТРЫМАННІ АБЛІГАЦЫЙ ПРАДСТАЎЛЯЮЦЬ АСТАЎШУЮСЯ Ў ІХ НА РУКАХ РАЗЛІКОВУЮ КВІТАНЦЫЮ ПА ПАЗЫЦЫ.

ПРАДЗЕЛЬНЫ ТЭРМІН АТРЫМАННЯ Ў АШЧАДНЫХ КАСАХ АБЛІГАЦЫЙ ПА ПАДПІСЦЫ НА ПАЗЫКУ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ (выпуск чацвертага года) — 1 ЧЭРВЕНЯ 1938 ГОДА.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР.

ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА НАСЕЛЬНІЦТВА ГОРАДА, што згодна пастановы прэзідыума Менгорсовета ад 29 жніўня г. г.

з 1 кастрычніка 1937 г.

уводзіцца САМАЗ'ЕМКА (самаразлік).

Усе абаненты (за выключэннем прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый)

ПАВІННЫ ЗНІМАЦЬ ПАКАЗАННЕ СВАІХ ШЧОТЧЫКАЎ

для правядзення разліку і аплаты за электраэнергію

Ў НАСТУПНЫЯ ТЭРМІНЫ:

Абаненты з № 1 па 8.000 — з 1 па 7 уключна кожнага месяца.
Абаненты з № 8000 па 16000 з 8 па 14 уключна кожнага м-ца.
Абаненты з № 16000 па 24000 —з 15 па 21 уключна кожнага м-ца.
Абаненты з № 24000 і вышэй —з 22 па 28 уключна кожнага м-ца.

Пры адсутнасці шчотчыкаў абаненты з'яўляюцца на электрастанцыю з кніжкамі, таксама прытрымліваючыся ўказаных вышэй тэрмінаў, згодна сваіх нумароў, дзе ім праводзіцца разлік.

КАБ УНІКНУЦЬ ЧАРГІ, ПРЫТРЫМЛІВАЙЦЕСЯ ТЭРМІНА АПЛАТЫ.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Уп. Галоўлітбела № К—3064. Друкарня «Звязды». Менск. Совецкая. 63. Ц. 5 к.